Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

8 ЖНІЎНЯ 2009 г. СУБОТА № 147 (26505)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.




### ПЕРШЫ МІЛЬЁН ТОН ХЛЕБА — АД МІНШЧЫНЫ

Як паведамілі рэдакцыі ў Мінскім аблвыканкаме, працаўнікі цэнтральнага рэгіёна да паўдня суботы плануюць сабраць першы мільён тон хлеба новага ўраджаю.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# БЕЛАРУСКАЯ СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА БУДЗЕ ДАВЕДЗЕНА ДА СТАНДАРТАЎ СУСВЕТНАГА ЎЗРОЎНЮ

**Беларуская сельская гаспадарка абавязкова будзе даведзена да стандартаў сусветнага ўзроўню. Аб гэтым заявіў 7 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі па рэгіёнах краіны.**

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ва ўборцы ўраджаю рабіць стаўку на хуткасць і якасць.

«Сёння галоўнае — хуткасць і якасць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы ў Ляхавіцкім раёне (Брэсцкая вобласць). — Таму што калі мы зноў раптам увойдзем у такую паласу дажджоў, як нядаўна была, можна забыць пра ўраджайнасць 35-40 ц/га».

Прэзідэнт таксама асабліва адзначыў, што сёння «лёс ураджаю краіны ў руках гаспадарак Віцебскай, Магілёўскай і поўначы Мінскай абласцей». «Гэтыя рэгіёны трэба «даціснуць», чаго б гэта ні каштавала, каб ураджай быў выратаваны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, стратэгічна важны рубеж ва ўборцы збожжа, якога трэба дасягаць неадкладна — гэта 85 працэнтаў убраных палёў. «Калі дасягнём 85 працэнтаў — тады можам сказаць, што ўраджай выратаваны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Не будзе тэмпаў сёння — не будзе якасці заўтра», — дадаў ён.

Прэзідэнт таксама ўзняў тэму эфектыўнасці перапрацоўкі саломы. «Не дай Бог, вы не папрацуеце з саломай, будзеце яе спальваць або пакідаць безгаспадарнай на палях. Тады наракайце самі на сябе», — сказаў беларускі лідар. «Навошта вы яе збіраеце на палях? Растрасіце яе, унясіце калій і азот. Калі мы цяпер своечасова ўнясём гэта ўгнаенне, тады ў нас будуць развязаны рукі вясной», — дадаў ён. «Гэта пытанне захавання фінансаў», — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць своечасовай уборкі не толькі збожжавых, але і лёну і бульбы, якія трэба любымі спосабамі ратаваць ад фітафторы. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў гэтым годзе вельмі вялікія накосы травы, і гэта трэба максімальна выкарыстаць для запасаў корму жывёле.

«Праграму адраджэння вёскі, як і ахову здароўя, мы выносім «за дужкі» крызісу. Гэта значыць, што тут мы нічога згортваць не маем намеру», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. «Калі мы, выконваючы праграму адраджэння вёскі, будзем спасылацца на крызіс, то мы яе правалім», — дадаў ён.

«Зразумела, чагосьці можа не хапаць, але трэба больш эфектыўна выкарыстоўваць ініцыятыву людзей, — адзначыў Прэзідэнт. — Нягледзячы на крызіс, трэба, сціснуўшы зубы, рухацца наперад».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць харчовай бяспекі для Беларусі, якая не толькі забяспечвае стабільнасць эканомікі, але і дае магчымасць актыўна прасоўваць айчынную прадукцыю на замежныя рынкі.

«Не трэба забываць, што ў свеце сёння мільярд чалавек недаядаюць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Нам проста трэба варушыцца, і мы з усім справімся», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы наведаў беларуска-дацкае замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белдан», якое займаецца сельскагаспадарчай вытворчасцю. У пачатку 2009 года тут уведзены ў эксплуатацыю свінакомплекс на 1500 галоў, у кастрычніку-снежні будзе створана другая чарга фермы па адкорме 35 тыс. свіней. Да 2011 года тут маюць намер выйсці на адкорм больш як 46 тыс. свіней штогод. Акрамя таго, плануецца будаўніцтва цэха па забоі свіней і перапрацоўцы мяса, а таксама камбікормавага завода і збожжасховішча.

Пры ўзвядзенні свінакомплексу быў прыменены шэраг новых для рэспублікі будаўнічых і праектных рашэнняў, а таксама сучасных тэхналогій гадоўлі жывёл.

Як расказаў Прэзідэнт, тры гады таму некалькі заходніх інвестараў прапанавалі рэалізаваць у Беларусі праекты па свінагадоўлі. Адзін комплекс, разлічаны на ўтрыманне 25 тыс. галоў, быў пабудаваны ў Магілёўскай вобласці па галандскіх тэхналогіях. У Ляхавіцкім раёне створаны свінакомплекс па тэхналогіях датчан. «Мы атрымалі самыя сучасныя свінакомплексы ў свеце, і цяпер ёсць узор, каб навучыць астатніх у Беларусі. Галандыя і Данія — экалагічна чыстыя краіны, там лепшыя, перадавыя тэхналогіі. На гэтых пілотных праектах мы навучыліся, як будаваць, ствараць новыя канструкцыі. Такім чынам, мы будзем перабудоўваць усю краіну ў гэтай галіне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле ацэнак экспертаў розных еўрапейскіх кампаній, якія маюць вялікі вопыт і працуюць у гэтым бізнэсе на рынку ў Заходняй і Усходняй Еўропе, ферма ЗТАА «Белдан» — самая лепшая на сённяшні дзень ферма ў Еўропе па якасці будаўніцтва і тэхналагічнай аснашчанасці. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў яго склаліся самыя добрыя ўражанні ад убачанага. Ён падкрэсліў, што па такім узоры паступова павінны быць рэканструяваны ўсе свінакомплексы ў рэспубліцы. Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што не трэба забываць і пра сацыяльную адказнасць бізнэсменаў. «У гэтым сутнасць развіцця вёскі і аграпрамысловага комплексу», — сказаў ён, адзначыўшы, што ЗТАА «Белдан» поўнасцю выконвае гэтыя патрабаванні.

Беларуская сельская гаспадарка будзе даведзена да стандартаў сусветнага ўзроўню.

Пасля наведвання свінакомплексу беларуска-дацкага ЗТАА «Белдан», Прэзідэнт падкрэсліў, што такія комплексы неабходна паступова ўкараняць ва ўсёй рэспубліцы. Тут прыменены не толькі сучасныя будаўнічыя тэхналогіі, але і створаны аптымальныя ўмовы для ўтрымання жывёл: устаноўлены сістэмы клімат-кантролю, вентыляцыі, цёплых падлог, тэхналагічных сістэм утрымання жывёл і сістэм гноевыдалення. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, сёння ў нас ёсць добрая магчымасць пераняць лепшыя перадавыя еўрапейскія тэхналогіі і ўкараніць іх у сябе.

«Вось узор. Нам трэба вызначыцца, колькі комплексаў неабходна ў рэгіёнах, і паступова рэканструяваць старыя і ствараць такія сучасныя комплексы. Нічога прыдумляць не трэба, мы ўжо бяром гатовыя тэхналогіі. Сёння іх трэба «выцягваць» з Еўропы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што ў гэтым становчыя рысы сусветнага крызісу, які садзейнічае таму, што еўрапейцы ідуць працаваць у новыя для сябе рэгіёны.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што да 1 студзеня 2010 года поўнасцю на еўрапейскія нормы выйдзе будаўнічая галіна. «З 2011 года, я ўпэўнены, мы будзем жыць, як у Еўропе, падцягнуўшы і іншыя напрамкі», — сказаў ён.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ДАІ ЗАКЛІКАЕ ВАДЗІЦЕЛЯЎ БЫЦЬ ВЕЛЬМІ ЎВАЖЛІВЫМІ З-ЗА НАДВОР'Я

**Дзяржаўтаінспекцыя заклікае вадзіцеляў быць вельмі ўважлівымі ў сувязі з пагаршэннем надвор'я, паведамілі ва ўпраўленні ДАІ МУС Беларусі.**

Паводле прагнозаў сіноптыкаў, сёння па паўднёвым усходзе рэспублікі чакаюцца ліўневыя дажджы і навальніцы. У такіх умовах значна пагаршаецца бачнасць. Пыл, што сабраўся на асфальце, і хімічныя злучэнні з першымі кроплямі дажджу ператвараюцца ў масленую плёнку, якая значна зніжае каэфіцыент счаплення колаў з дарогай і павялічвае тармазны шлях.

Таму, апынуўшыся ў паласе дажджу, неабходна адразу ж плаўна знізіць скорасць і ўстрымацца ад рэзкіх манёўраў і тармажэнняў. Не трэба забываць уключаць шклоачышчальнікі і перыядычна выкарыстоўваць шклоамывальнік. Акрамя таго, Дзяржаўтаінспекцыя ў такіх умовах рэкамендуе ўключаць блізкае святло фар, а пры спыненні — аварыйную светлавую сігналізацыю. Так іншым удзельнікам дарожнага руху будзе лягчэй заўважыць ваш аўтамабіль.

**БЕЛТА.**

### РАБОЧЫ «ЗАМІНІРАВАЎ» РАЙВЫКАНКАМ

**Паведамленне аб тым, што ў Жабінцы ў будынку райвыканкама закладзена выбуховае прыстасаванне, невядомы зрабіў па тэлефоне «101».**

У ходзе комплексу мерапрыемстваў, што былі праведзены на месцы, на якое паказаў «бамбіст», ніякага выбуховага прыстасавання не аказалася. Затое праваахоўнікам удалося высветліць асобу ананіма, які зрабіў трывожны званок. Ім аказаўся 40-гадовы рабочы ААТ, жыхар вёскі Грыцэвічы, які затрыманы.

У гэты ж дзень у Гомелі па тэлефоне «102» яшчэ адзін «дабрадзей» паведаміў пра замініраванне дома № 4 па вуліцы Сялянскай. І гэта інфармацыя не спраўдзілася. Як і ў першым выпадку «мінёра» ўдалося затрымаць: такім чынам «свавольнічаў» мясцовы жыхар, вучань 9-га класа дапаможнай школы.

**Ул. інф.**

### ДЗІК «СУТЫКНУЎСЯ» З АДНЫМІ, СПАКУСІЎ ДРУГІХ

**Калі ў начны час работнікі Гомельскай аблінспекцыі спынілі для праверкі аўтамабіль «ВАЗ-2101», у яго салоне знаходзіліся два чалавекі. А ў багажніку — туша дзіка вагой 200 кілаграмаў.**

Затрыманыя патлумачылі, што дзічыну яны падабралі з узбочыны аўтадарогі Гомель—Бранск. Там сапраўды былі знойдзены сляды ад сутыкнення транспартнага сродку з дзіком. На аўтамабілі ж затрыманых пашкоджанні адсутнічалі. Тым не менш туша была канфіскавана, а ў дачыненні да асобаў, якія парушылі прыродаахоўнае заканадаўства, распачаты адміністрацыйны працэс.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### КІРОЎЦА НАЕХАЎ НА ЛАСЯ. ПАЦЯРПЕЛА ДЗІЦЯ

**Позна ўвечары на 9-м кіламетры аўтадарогі Барысаў — Беразіно пад колы аўтамабіля трапіў лось: у гэтым здарэнні пацярпела дзіця.**

Паводле звестак ДАІ МУС, дарожна-транспартнае здарэнне адбылося а палове адзінаццатай вечара. 31-гадовы кіроўца аўтамабіля «Фальксваген-Каравэла» ўчыніў наезд на дзікую жывёліну ў той момант, калі лось перабягаў дарогу. Трохгадовая дачка кіроўцы, якая ехала з бацькам у машыне, атрымала раненні.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПАДАРУНАК ДЛЯ ЗЛОДЗЕЯ

**У Рэчыцкай краме бліжэй да вечара мінімум на паўгадзіны былі пакінуты незачыненымі дзверы з «чорнага» ходу, у памяшканні быў незачынены пакой, дзе знаходзіцца каса, у ёй — незачынены сейф, а ў ім — 13,5 мільёна рублёў.**

Іголку ў яйку здабыў невядомы грамадзянін, якога цяпер шукае рэчыцкая міліцыя, паведамляе прэс-служба Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.08.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 822,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 054,09 |
| 1 латвійскі лат | 5 766,24 |
| 1 літоўскі літ | 1 173,34 |
| 1 чэшская крона | 156,23 |
| 1 польскі злоты | 972,48 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 89,45 |
| 1 украінская грыўня | 349,78 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,5473 |
| UAH | 39,1018 |
| 1000 BYR | 11,2268 |
| EUR | 45,2893 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ЧУП «РУСЦ» ДОСААФ (Продавец) КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит очередной открытый аукцион по продаже *изолированного помещения*, об. пл. 379,8 кв.м (цокольный, 1, 2 и 3 этажи), расположенного в административном здании по адресу: *г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7.* Начальная цена с НДС *(снижена на 50 %)* – 1 500 000 000 бел. руб. Задаток в сумме 50 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **17.08.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.08.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

Спажывец

# РЭКАМЕНДАВАНЫ ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА ПЛАДОВА-ЯГАДНУЮ СЫРАВІНУ

**Спецыяльная камісія, у склад якой увайшлі прадстаўнікі канцэрна «Белдзяржхарчпрам», Белкаапсаюза, Дэпартамента па цэнаснай палітыцы Міністэрства эканомікі і кіраўнікі чатырох перапрацоўчых прадпрыемстваў, вызначыла закупачныя цэны, што рэкамендуюцца, на пладова-ягадную сыравіну для прамысловай перапрацоўкі.**

У прыватнасці, на сліву — 700 рублёў за кілаграм, на алычу — 300 рублёў, на яблыкі — 210—250 рублёў, на журавіны, брусніцы — 2500, на буякі — 3000, на чырвоную рабіну — 750, чарнаплодную рабіну — 1 200 рублёў за кілаграм. Як мяркуюць у канцэрне «Белдзяржхарчпрам», вызначэнне адзіных цэнаў на сыравіну, што нарыхтоўваецца, паставіць у роўныя ўмовы кансерваныя і вінаробчыя арганізацыі, нарыхтоўчыя арганізацыі спажыўкааперацыі, а таксама забяспечыць канкурэнтаздольнасць гатовай прадукцыі па цане на ўнутраным і знешнім рынках. На астатнія віды сыравіны будуць фарміравацца дагаворныя цэны.

У краіне перапрацоўкай пладова-ягаднай сыравіны займаюцца 103 арганізацыі розных формаў уласнасці, у тым ліку: 41 — для вытворчасці плодаагароднінай кансерваванай прадукцыі і 62 — для вытворчасці пладовых вінаў. Сёлета перапрацоўчым арганізацыям неабходна нарыхтаваць пладова-ягаднай сыравіны 236 тысяч тон, у тым ліку: 169 тысяч тон — для вінаробства і 67 тысяч тон — для кансервавання, а таксама 40,7 тысячы тон агароднінай сыравіны.

У адпаведнасці з праграмай нацыянальных дзеянняў па папярэджанні і пераадоленні п'янства і алкагалізму на 2006—2010 гады, прадугледжваецца абавязковае штогадовае скарачэнне вытворчасці пладовых вінаў не менш чым на 10 працэнтаў у год. У выніку патрэба ў сыравіне ў галіне скарацілася са 196 да 169 тысяч тон (на 8 працэнтаў). Незапатрабаваныя ў вінаробстве рэсурсы пладова-ягаднай сыравіны, а гэта каля 16 тысяч тон, плануецца перанакіраваць у кансервавую галіну для вытворчасці натуральных і канцэнтраваных сокаў, пюрэ-паўфабрыкатаў і інш. Ці гатовыя прыняць гэтыя аб'ёмы кансервавыя прадпрыемствы?

Спецыялісты сцвярджаюць, што ў выніку праведзенай за апошнія гады мадэрнізацыі прадпрыемстваў галіны магутнасці па вытворчасці плодаагароднінных кансерваў толькі за 2008 год павялічыліся больш чым удвая і дасягнулі 734 муб у год. Таму асноўная задача бачыцца ў загрузцы вытворчых наяўных магутнасцяў да ўраджаю наступнага года разнастайнай пладова-ягаднай і агароднінай сыравінай для выпуску запатрабаванага асартыменту прадукцыі.

З іншага боку, спецыялісты канцэрна «Белдзяржхарчпрам» канстатуюць праблему з тэмпамі нарыхтоўкі сыравіны. На сёння, да прыкладу, нарыхтоўка вішні, чорных і чырвоных парэчак, агрэсту, чарніц практычна завершана, але аб'ёмы іх нарыхтоўкі значна меншыя, чым былі летась, і чым планавалася нарыхтаваць сёлета. Скажам, патрэба ў вішні па краіне забяспечана ўсяго толькі на 39 працэнтаў, у чырвоных парэчках — на 21,4 працэнта, чорных — 45,4 працэнта, маліне — 76,7 працэнта.

Гэта можа прывесці да выпуску вузкага асартыменту прадукцыі, якая не будзе запатрабавана пакупнікамі. Таму кіраўнікам прадпрыемстваў, якія па нейкіх прычынах не паспелі з нарыхтоўкамі, неабходна зрабіць захады па папаўненні аб'ёмаў недаатрыманай сыравіны іншымі відамі: слівай, брусніцамі, буякамі, малінай, журавінамі, чарнаплоднай рабінай.

Існуе і яшчэ адна сур'ёзная праблема: штогод скарачаецца рэсурс пладова-ягаднай сыравіны на прыватных падворках, а новых прамысловых садоў у краіне закладваецца ў недастатковым аб'ёме. Гэтую праблему, як мяркуюць спецыялісты, можна вырашыць толькі вельмі аператыўнымі дзеяннямі па закладцы ўласных садоў уласна прадпрыемствамі. Канцэрн «Белдзяржхарчпрам» таксама прапануе заключаць доўгатэрміновыя дагаворы з фермерамі і сельгасарганізацыямі, а таксама ствараць кааператыўна-інтэграцыйныя структуры з удзелам сельгасарганізацый.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Падрабязнасці

Віталь СЕЎРУКЕВІЧ:

# «Дэкрэт №10: прыцягнуць новых інвестараў, ператварыць усю краіну ў свабодную эканамічную зону»

**«Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя брала ўдзел у падрыхтоўцы Дэкрэта Прэзідэнта № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», паведаміў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» першы намеснік старшыні па прававых і агульных пытаннях БНПА Віталь СЕЎРУКЕВІЧ. Паводле яго слоў, па сваім змесце і ў сферы рэгулявання гэты дакумент накіраваны на прыцягненне новых інвестараў, новых інвестыцый на падставе заключэння інвестыцыйных дагавораў.**

— Сярод станоўчых момантаў Дэкрэта №10 адзначу тое, што дакументам больш дакладна вызначаныя ўзроўні заключэння інвестыцыйных дагавораў у залежнасці ад тых ці іншых параметраў і льгот, якія інвестар хацеў бы атрымаць, — кажа Віталь Сеўрукевіч. — Інвестыцыйны дагавор можна заключаць альбо на падставе рашэння рэспубліканскага органа дзяржкіравання, альбо на ўзроўні Саўміна, узгодненага з кіраўніком краіны, ці на ўзроўні мясцовых органаў улады, калі інвестару не патрабуюцца нейкія прэферэнцыі. Акрамя таго, больш дакладна вызначаныя пытанні будаўніцтва аб'ектаў, прадугледжаных інвестыцыйным дагаворам. Інвестарам, якія заключылі інвестыцыйныя дагаворы, прапануюцца такія агульныя прэферэнцыі, як прадастаўленне зямельнага ўчастка ў арэнду без правядзення аўкцыёну, увоз тэхналагічнага абсталявання і запасных частак да яго для аб'ектаў, звязаных з рэалізацыяй інвестыцыйнага праекта, без платы мытных пошлін і падатку на дабаўленую вартасць. Да таго ж інвестар вызваляецца ад пакрыцця страт сельскагаспадарчага прадпрыемства, а таксама кампенсацыйных выплат, звязаных з пераносам і высечкай зялёных насаджэнняў на землях населеных пунктаў і шмат іншых прэферэнцый. На мой погляд, у дакуменце можна было б адлюстраваць пытанне па абароне інвестыцый, але магчыма, заканадаўцы выдадуць асобны нарматыўны акт па ім.

**— На ваш погляд, тое, што ўмовы вядзення інвестыцыйнай дзейнасці ў рэспубліцы будуць палегчаныя, прывядзе да росту інвестыцыйнай прывабнасці нашай краіны?**

— Так, несумненна, гэта крок наперад. Хацелася б, каб былі і другі, і трэці крокі... Між іншым, на апошнім пасяджэнні савета нашай асацыяцыі і пасяджэнні рэспубліканскага савета дырэктараў, на якіх ішла размова аб рэалізацыі транспартна-лагістычных аб'ектаў у Беларусі і рэалізацыі гандлёва-інвестыцыйных праектаў у рамках удзелу краіны ў саюзах, у прыватнасці, з Расіяй, СНД, прагучала правільная думка: нам трэба пераходзіць ад асобных лагістычных цэнтраў, асобных свабодных эканамічных зонаў да лагістычнай краіны, да свабоднай эканамічнай зоны на ўсю Беларусь. Умовы, якія сёння ёсць у свабодных эканамічных зонах, у Парку высокіх тэхналогій, сябе нядрэнна зарэкамендавалі, і іх трэба распаўсюджваць на ўсю рэспубліку. Дэкрэт № 10 можна разглядаць як крок да таго, каб мы будавалі лагістычную краіну, абсалютна празрыстую і адкрытую для ўсіх інвестараў. Прычым не толькі для тых, якія прыходзяць да нас на падставе інвестыцыйнага дагавора, але і для дробных інвестараў, якія з-за сваіх абмежаваных фінансавых магчымасцяў не хочуць звязвацца з распрацоўкай нейкіх планаў, вялікіх праектаў і інвестыцыйных дагавораў. Апошнія гатовыя ствараць, дапусцім, сумесныя прадпрыемствы, адкрываць працоўныя месцы не ў Мінску, ці Гомелі альбо Магілёве, а дзесьці, напрыклад, у Бягомлі, у Слоніме і г.д., гэта значыць у тых нашых малых гарадах і пасёлках, дзе сёння гэта вельмі патрэбна. Для гэтай важнай мэты Дэкрэт з'яўляецца сур'ёзным крокам да лагістычнай Беларусі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### У Мінску амаль 950 кватэр у дамах, якія будуць пабудаваны сёлета, не маюць патэнцыяльных уладальнікаў

**Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Мікалай КОМ.**

Каб дапамагчы забудоўшчыкам заключыць пад узвядзенне гэтых кватэр дагавора з мінчанамі, якія стаяць на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, ва ўпраўленні жыллёвай палітыкі вырашылі развярнуць маштабную інфармацыйную кампанію.

Аддзелы жыллёвай палітыкі раённых адміністрацый будуць прымаць заявы ад чаргавікоў, гатовых будаваць кватэру, і пасля выдаваць ім накіраванні для заключэння дагавора з забудоўшчыкам. Акрамя таго, гараджане і самі могуць звярнуцца па гэтым пытанні ў бударганізацыі. Як адзначыў Мікалай Ком, забудоўшчыкам у сваю чаргу неабходна праводзіць гібкую цэнавую палітыку, зніжаць цэны на жыллё.

**«Мінск—Навіны».**

ISSN 1990 - 763X

# ШАСЦІГАДОВЫЯ ТУРЫСТЫ, ці Разам весела крочыць па родных прасторах







*У садку № 528 горада Мінска дзеткі старэйшай групы ходзяць у сапраўдныя паходы. Вучачыся арыентавацца на мясцовасці, збіраюць гербарыі, ставяць палаткі і складваюць заплечнікі. А яшчэ — набіраюцца моцы і здароўя. У заплечніках — усё самае неабходнае. Вада, ліхтарык, бінокль, компас, аптэчка, карты для арыентавання — гэты турыстычны набор ведаюць на зубок і ўмеюць ім карыстацца дзеткі ўсіх узростаў. У паходы ж, няхай і зусім недалёкія — у бліжэйшы лясок за «Лакаматыў», — ходзяць толькі старэйшыя. Усе разам раскладваюць вогнішча (і вядома, дарослыя, вельмі хутка спосабам, напрыклад, домікам ці калодзежам) і «вараць» бульбу. Ніводны паход не абыходзіцца без вясёлых песень каля вогнішча.*

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

# Міхаіл ДЗЯМІДАЎ: «ГІПРАЖЫЎМАШ» — ПРАЕКТЫ Ў ЖЫЦЦЁ

**— Міхаіл Сямёнавіч, мне неаднаразова даводзілася сустракацца з былым дырэктарам вашай установы Уладзімірам Кірылавічам Крыкуном, а вы, тады, здаецца, працавалі ў інстытуце галоўным інжынерам. Ведаю таксама, што першым дырэктарам яго быў Міхаіл Андрэевіч Кліменка, які раней працаваў старшынёй Гомельскага аблвыканкама. Калі не памыляюся, дык у лютым 1971 года ў Гомельскім філіяле Кіеўскага інстытута «Гіпрасельмаш» было ўсяго 19 супрацоўнікаў. Ці не так?**

— Усё правільна. Скажу больш. Першыя пяць гадоў калектыў кватараваў па бытавых памяшканнях заводаў «Гомсельмаш» і «Цэнтраліт», рос як колькасна, так і прафесійна, адначасова павышаючы свае веды на будаўніцтве таго будынка-шматпавярховіка, які мы займаем. У 1978 годзе філіял стаў інстытутам, і за зменай назвы яго стаіць пастаупальнае накапленне вопыту праектавання, адбору і фарміравання кадраў, пашырэнне сферы дзейнасці як па тэматыцы, так і па геаграфіі аб'ектаў.

## ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ



*Дырэктар інстытута Міхаіл ДЗЯМІДАЎ.*

**Закончыў у 1964 годзе Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум, адслужыў у арміі і пэўны час працаваў у філіяле праектнага інстытута «Белкамунпраект». У лютым 1971 года уладкаваўся на працу ў горадзе на Сожы ў філіял Кіеўскага інстытута «Гіпрасельмаш», афіцыйнае адкрыццё якога адбылося ў красавіку таго ж года. Такім чынам атрымалася, што Міхаіл Сямёнавіч працуе ў «Гіпражыўмашы», які ў розныя часы меў розныя назвы, 38 гадоў.**

**Пачынаў ён тут з пасады старшага інжынера, адначасова паступіўшы на вячэрні факультэт Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту, які паспяхова закончыў і прайшоў усе прыступкі прафесійнага росту: кіраўнік групы, сектара, намеснік начальніка аддзела, начальнік яго, намеснік галоўнага інжынера, галоўны інжынер, дырэктар. Праектную справу, як кажуць, Міхаіл Сямёнавіч вывучыў знутры, ведае яе дасканала. Ён — член-карэспандэнт Беларускай інжынернай акадэміі.**

**У інстытуце вядучым інжынерам-нормакантралёрам аддзела якасці і інжынерна-тэхнічнага забеспячэння працуе яго жонка Антаніна Іванаўна, а сын Аляксей — начальнікам планава-вытворчага аддзела. Ён закончыў факультэт кіравання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту.**

**— Мне памятаюцца часы, калі ваш інстытут, як кажуць, па самыя вушы быў заняты на праектных работах новых вытворчых магутнасцяў «Гомсельмаша». Цяжка было?**



*Галоўны інжынер праектаў Тамара ЗОРЫНА мае багатую практыку работы. Яна працавала на новай Зямлі, Ямале. Яе праекты вызначаюцца высокай якасцю. Па шляху Тамары Міхайлаўны пайшоў яе сын Андрэй, які працуе галоўным інжынерам праектаў. Па выніках мінулага года Тамара Зорына прызнана лепшым ГІПам інстытута.*

— І цікава. І мы, і завод належалі да Міністэрства жывёлагадоўлі і кормавытворчасці Савецкага Саюза, і пашырэнне «Гомсельмаша» было сапраўдным бумам для многіх арганізацый. У тым ліку і для нашага калектыву. Уявіце сабе, што ён складаў каля 560 чалавек! Мы працавалі ў сваёй галіне тады на ўсю краіну: з Поўначы на Поўдзень, з Захаду на Усход.

**— А затым — рэзкі спад...**

— Пра гэта сумна казаць. Усе памятаюць паласу крызісу і застою, жорсткага рэфармавання, якія прыпалі на 1990—1992 гады ў сувязі з развалам вялікай адзінай краіны. Што датычыцца нас, дык тады аб'ёмы праектных работ рэзка знізіліся і больш чым у тры разы скарацілася колькасць супрацоўнікаў інстытута, якая склала ўсяго 170 чалавек. Але калектыў мужна перанёс усе тыя цяжкасці і беды, загартаваўся, абнавіўся і працягнуў сваю дзейнасць.

**— Якім чынам?**

— Калі да вышэйназваных часоў мы займаліся праектаваннем прамысловых прадпрыемстваў (жывёлагадоўлі і кормавытворчасці), і гэта было галоўным нашым напрамкам, дык потым пачалі рабіць свае прафесійныя паслугі ў будаўніцтве жылля, аб'ектаў экалогіі, аховы здароўя, адукацыі і г.д. Бо на парадку дня стаяла задача: выжыць, не паляцець у фінансавую бездань. З усёй упэўненасцю скажу, што нашай заслугай з'яўляецца тое, што здолелі захаваць касцяк калектыву і тэхналогію. Дзякуючы гэтым і іншым фактарам мы пайшлі наперад.

**— І што — сёння?**



*Малады спецыяліст Марына ПОВАД. Працуе ў інстытуце ўсяго тры гады, але ўжо добра зарэкамендавала сябе. Завочна вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту.*

— Сёння? Працуем. Гэты год стаў новай вяхой у гісторыі прадпрыемства. Калі яно было рэспубліканскім праектным унітарным, дык у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў рэспублікі пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства, якое носіць тую ж самую назву. Нягледзячы на тое, што змянілася форма уласнасці, мы па-ранейшаму застаёмся запатрабаванымі. І можна смела сцвярджаць, што ААТ «Гіпражыўмаш», якое мае сертыфікат адпаведнасці Сістэмы менеджменту якасці праектавання міжнародным стандартам СТБ ISO 9001, з'яўляецца адным з вядучых у нашай краіне галіновых інстытутаў. Мы цяпер праектуем як прамысловыя прадпрыемствы, так і грамадскія і грамадзянскія збудаванні, аб'екты экалогіі і да т.п. Бадай што (не падумайце, што хвалюся), у нас самыя складаныя праекты сярод аднатыпных калектываў Гомеля, мы ажыццяўляем комплекснае праектаванне — ад тэхналогій да праектна-каштарыснай дакументацыі. І ў гэтым — наша прэрагатыва. І яшчэ. Супрацоўнікі цвёрда ведаюць наступнае: высокая якасць праектаў — ключ да канкурэнтаздольнасці. І добрапрыстойнасць: даў слова — стрымай яго. Вызначыў тэрміны выканання работ — не дапусці іх зрыву.

**— Міхаіл Сямёнавіч, у фае развешаны шматлікія фотаздымкі будынкаў і збудаванняў, якія праектаваў ваш калектыў, а ў вашым кабінеце ляжыць звычайная цагліна. Што азначае гэты прадмет: падарунак ці нейкі ўспамін?**

— *(Усміхаецца.)* Цагліна гэта не звычайная. Далёка не звычайная. Яна — напамінак аб той вялікай і адказнай рабоце, якую мы выканалі не так даўно.

**— Што вы маеце на ўвазе?**

— Наступнае. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 714 ад 5 снежня 2006 года ў мэтах больш поўнага выкарыстання прыродных рэсурсаў Гомельскай вобласці, развіцця малых гарадоў наш інстытут быў прызначаны генеральнай арганізацыяй па праектаванні камбіната будаўнічых матэрыялаў у гарадскім пасёлку Лоеў. Усё там пачыналася з нуля. Будоўлю курыраваў віцэ-прэм'ер Урада краіны Віктар Паўлавіч Буры, а штотыднёвыя штабы праводзіў намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Рыгоравіч Надтачаеў з яго напорам і высокай патрабавальнасцю да ўсіх удзельнікаў будаўнічага канвеера.

Звычайна на падобныя праекты адводзіцца 24 месяцы, мы ўклаліся ў 12, і будаўнікі — у 16 месяцаў таксама замест 24. Тым самым быў значна скарочаны інвестыцыйны цыкл, і прадпрыемства ўжо працуе, выпускае патрэбную прадукцыю. Яно з'яўляецца горадаўтваральным, і тут створана 150 новых працоўных месцаў.

**— Што ўяўляе камбінат?**

— Ён уведзены ў строй 31 снежня мінулага года, і тут упершыню за апошнія 20 гадоў у Беларусі ўкаранёна айчынная аўтаматызаваная тэхналагічная лінія па вытворчасці керамічных сценавых матэрыялаў, якая па асноўных тэхнічных паказчыках адпавядае лепшым сусветным узорам. Першая выпушчаная прадукцыя пацвердзіла свае высокія фізіка-механічныя паказчыкі. А менавіта: марозаўстойлівасць — 50—100 цыклаў, трываласць — 20 мегапаскаляў і нізкае водапаглынанне (8—10 працэнтаў). Прадукцыя сертыфікавана.

Цеплавыя агрэгаты камбіната працуюць у аўтаматычным рэжыме. Цяпло печы абпалу не ідзе ў атмасферу, а паступае ў печ сушкі, што азначае: яно паўторна выкарыстоўваецца. Замкнуты цыкл, адным словам. Кацельня працуе на мясцовых відах паліва. Гэта і іншае дазваляе зніжаць спажыванне энергетычных рэсурсаў у тэхналагічным працэсе і павышаць якасць вырабаў. Заяўленая вытворчая магутнасць камбіната — 20 мільёнаў штук умоўнай цэглы.



*Лоеўскі камбінат будаўнічых матэрыялаў. Яго праекту Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку.*

**— Усім, Міхаіл Сямёнавіч, вядома, што на прадпрыемства наведаўся кіраўнік дзяржавы...**

— Зрабіўшы рабочы візіт туды, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка даў высокую ацэнку праекту і падкрэсліў, што ён дазволіць не толькі зняць праблему дэфіцыту ўказанай прадукцыі на Гомельшчыне, але і пастаўляць яе на экспарт, і што наладжванне найноўшай вытворчасці цэглы з'яўляецца вельмі сучасным.

**— Калі пайшла ўжо гаворка пра аб'екты, якія вы праектавалі, дык што яшчэ можаце сказаць пра іх?**

— Яны — наша стаpанне, уменне, творчасць. За апошняе дзесяцігоддзе з'явіліся прынцыпова новыя напрамкі ў дзейнасці інстытута, і, як вынік, дзясяткі пабудаваных аб'ектаў, адны з якіх з'яўляюцца для Гомеля горадаўтваральнай значнасцю, іншыя — безумоўным рарытэтам у галіне найноўшых тэхнічных дасягненняў. Лоеўскую новабудоўлю я ўжо назваў. Мы з'яўляемся генеральнай праектнай арганізацыяй Петрыкаўскага керамзітнага завода «Гомельскі домабудаўнічы камбінат». Патрэбнасць у керамзіце будаўнічай галіны цяпер вялікая. Назаву і такія ўнікальныя прадпрыемствы, як комплекс ІААА «Белшклопрам» Гомельскі інжынерны інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, офісны цэнтр у Гомелі па вуліцы Гагарына, асобныя аб'екты Цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, культавыя збудаванні — Храм Аляксандра Неўскага па вуліцы Ільіча і каталіцкі касцёл па вуліцы Савецкай. І гэта — далёка не поўны пералік.



*Начальнік аддзела водазабеспячэння і водаадвядзення Юрый ЦІТОВІЧ і начальнік сектара Эмілія ГРАМЫКА абмяркоўваюць праект ачышчальных збудаванняў Рэчыцкага метызнага завода.*

**— Над чым працуе ваш калектыў сёння?**

— Заканчваем праектаванне пажарнага дэпо на 10 аўтамабіляў у вялікім 19-м мікрараёне абласнога цэнтра, інжынернага комплексу інстытута МНС. Нас просяць зрабіць праект рэканструкцыі Жлобінскага завода жалезабетонных вырабаў домабудаўнічага камбіната № 3 пад вытворчасць канструкцый для жылых дамоў метадам так званага «шырокага кроку». Маецца заяўка мазыран на рэканструкцыю аналагічнага прадпрыемства.



*Начальнік аддзела электразабеспячэння, аўтаматызацыі і сувязі Міхаіл КАЖЭЎНІКАЎ абмяркоўвае праект рэканструкцыі ААТ «Гомельшкло» з вядучым інжынерам, інжынерамі другой і першай катэгорый Генадзем КАВАЛЁВЫМ, Юрыем ДУБАВЫМ і Максімам ГРУЗЯНКОВЫМ.*

Для «Гомсельмаша» распрацоўваецца праект мадэрнізацыі пралёта афарбовачнага цэха 101-га корпуса з мэтай размяшчэння там паточна-механізаванай лініі італьянскай фірмы «Imel». Яна ўстанаўліваецца замест трох састарэлых ліній, і планаваная гадавая праграма афарбоўкі паверхняў вузлоў і дэталяў сельскагаспадарчых машын складае 621 755 квадратных метраў. Гэта — вялікі крок наперад. Наогул, «Гомсельмаш» — адзін з самых галоўных нашых заказчыкаў. На заводзе ліцця і нармаляў гэтага прадпрыемства мы робім праект новай афарбовачнай камеры. Там жа спраектавалі ўстаноўку плавільнай печы фірмы «ОТТО-ЮНКЕР» у цэху высокатрывалага чыгуну, што дае вялікую эканомію электраэнергіі.

Для ПРУП «Экапластсэрвіс» распрацоўваем праект участка па выпуску люкаў з палімерна-пясочнай сумесі, якія будуць устанаўлівацца на калодзежах сетак водапровода, каналізацыі, цепла- і газазабеспячэння ў месцах, не прызначаных для праезду аўтатранспарту (у зонах зялёных насаджэнняў, пешаходных зонах і на тратуарах). Галоўная перавага гэтага ўнікальнага вырабу — эстэтыка, бяспека, даўгавечнасць, абсалютная ўстойлівасць да кіслот, нафтапрадуктаў, ультрафіялету.

Выконваем мы заказы таксама «Беларуснафты», нафтаправода «Дружба», Рэчыцкага метызнага завода, «Гомельдрэва», «Бабруйскаграмаша», Барысаўскага завода агрэгатаў. Усіх нашых партнёраў цяжка нават пералічыць.

**— Па ўсім відаць, Міхаіл Сямёнавіч, што адносіны з імі ў вас нармальныя. Але, напэўна, іншым разам узнікаюць і праблемы?**

— На гэта пытанне адкажу так. Асноўныя фонды многіх прадпрыемстваў зношаны да 75 працэнтаў, таму абнаўленне і рэканструкцыя іх — задача нумар адзін. І ў гэтым сэнсе мы запатрабаваныя. Але ў большасці заводаў фінансаў на тэхнічнае пераўзбраенне не хапае. У такім выпадку мы ідзём ім насустрач, знаходзім кампраміс.

**— Я заўважыў, што ў вас працуе шмат пенсіянераў...**

— Вы не памыліліся. Справа ў наступным. Калектыў інстытута папаўняецца ў асноўным за кошт выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, Гомельскага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога, Гомельскага дарожна-будаўнічага каледжа. У крызісныя 90-я гады, як я ўжо гаварыў, многія кадры інстытута звольніліся ў пошуках лепшых заробкаў. Навічкі, якія прыходзяць да нас, без дапамогі настаўнікаў-ветэранаў адаптаваліся б тут і набывалі неабходную практыку даволі працяглы час. Таму мы не спяшаемся развітвацца з тымі, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту. Такіх у нас 65 чалавек, 25 працэнтаў усяго персаналу. Гэта спецыялісты вельмі высокай кваліфікацыі, якімі мы ганарымся.

Адзін з іх — галоўны інжынер праектаў Барыс Мікітавіч Казак, па слядах якога пайшла яго дачка Ірына Навіцкая (таксама ГІП). Ён, як і іншыя ветэраны вытворчасці (шкада, што з-за невялікага памеру матэрыялу не магу ўсіх назваць) заслугоўвае самых пахвальных слоў.

Карыстаючыся выпадкам, віншую калектыў з Днём будаўніка. Шчыра жадаю, паважаныя калегі, моцнага здароўя, сямейнага шчасця, дабрабыту, добрага настрою. Дзякуй усім вам за вашу работу.

**Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**



*Пра кадры інстытута начальнік іх аддзела Ала БАЙЖАВА ведае ўсё.*

**ААТ «ГІПРАЖЫЎМАШ»**
**246050, г. Гомель, праспект Леніна, 10**
**тэл./факс 74 93 37, 74 92 73**
УНП 400084685

# МІНСК—ПЕТУШКІ

## Менавіта па такім жыццёвым маршруце аднойчы адправіўся Віктар Васільевіч Хадановіч і потым не пашкадаваў аб пераездзе ў вёску

### Удача стаць вяскоўцам

— Я правільна зрабіў, мне пашанцавала, — мужчына адчыняе дзверы гаражоў, дзе стаяць дзве новенькія іншамаркі. — Я ў сталіцы ніколі б так не жыў, як у вёсцы. Там зарабляў бы толькі на пражыццё і капейкі лічыў, а тут працую шмат, але ні ў чым сабе не адмаўляю.

Сакрэт заможнасці звычайнай сялянскай сям'і — у вялікай падсобнай гаспадарцы. Летась, паводле статыстыкі Комсеніцкага сельскага Савета, муж і жонка Хадановічы здалі дзяржаве амаль 32 тоны малака.

— Калі я толькі прыехаў у Петушкі, то заходзіў у хлеў і праз хвіліну выскокваў адтуль, заціснуўшы нос, — смяецца гаспадар. — А цяпер і не заўважаю гэтага паху...

Так, калісьці Валянціна Аляксандраўна і Віктар Васільевіч пазнаёміліся ў Мінску. Мужчына за тым часам працаваў у адміністрацыйнай ахове партыйных будынкаў, і зусім не меркаваў мяняць асфальт і гарадскія выгоды на хлеў ды агарод. Але ўсё ж паехаў на радзіму маладой жонкі, дзе сужэнцы сталі працаваць у вясковай краме.

Яны заўсёды трымалі жывёлу і вырошчвалі бульбу, што давала магчымасць сям'і не бедаваць нават не ў самыя сытныя часіны. І нарэшце ў 1998 годзе муж з жонкай вырашылі кінуць сталую працу і падацца на цяжкія, але вольныя хлябы падсобнай гаспадаркі.

— Заробак у краме быў невялікі, а праца нервовая, — проста тлумачыць тыя змены Хадановіч. — Дома спакайней, ды і зарабіць на ўласнай гаспадарцы, калі ёсць рукі і жаданне працаваць, можна болей.

### Развод і кожнаму гектар

...Хата на ўскраіне Петушкоў, невялікай і акуратнай вёсачкі. Традыцыйны палісаднік з кветкамі, цяністы дворык. Усё па-вясковаму сціпла: няма ніякіх еўрарамонтаў і сучаснай пластмасы, толькі старая традыцыйная ўтульнасць.

Ад іншых хату адрознівае бадай што спадарожнікавая тэлевізійная антэна. Праўда, прагляд тэлепраграм абмяжоўваецца навінамі для Віктара Васільевіча і адным серыялам для яго жонкі: часу нестае на адпачынак, тым больш у сезон.

Хадановічы жывуць і працуюць нібыта на хутары: суседзяў няма, навокал — гаспадарчыя пабудовы, сховішчы для бульбы і збожжа, хлявы і палеткі. Валянціна Аляксандраўна паказвае яшчэ адну сямейную ўласнасць: валун, выцягнуты з агарода на ўскраіну дарогі.

— Я мяркую пачысціць вялізны камень і напісаць на ім лозунг: «Любіце працу!», — усміхаецца гаспадыня.

Гаспадарка Хадановічаў — як невялікі калгас. Аснова дабрабыту — 6 кароў: штодзень сям'я здае да 150 літраў малака. Потым яшчэ дзясятак-другі свіней і бульба, якой летась прадалі 14 тон.

Сям'я апрацоўвае цэлыя зямельныя плантацыі.

— Вы не паверыце, мы аднойчы развяліся дзеля гектара зямлі, — усміхаецца Віктар Васільевіч. — У пачатку 1990-х гадоў вясковай сям'і давалі толькі па гектары зямлі, а нам не хапала гэтага. Тады мы афіцыйна разышліся, і атрымалі кожны па гектары. А калі гэта стала неактуальна, зноў пажаніліся. Праўда, святкуем ранейшы дзень вяселля, бо новы быў нібыта несапраўдны, фіктыўны.

### Сочы як войска

— Я тры гады раблю справаздачнасць і разлічваю наш заробак у месяц, — паведаміў гаспадар. — Спачатку мы зараблялі штомесяц па 1 мільёне 470 тысяч рублёў, на другі год — 1,530 мільёна, а летась атрымалася 1,880 мільёна рублёў. Нядрэнна, ці не так?

— Грошы маем, але ўсё працай зароблена! — усплёсквае рукамі Валянціна Аляксандраўна. — Людзі часта бачаць толькі вынік, а ў спякоту нікому даіць кароў не хочацца. Ніхто не глядзіць, колькі тут працы.

Раніцай пад'ём — а 4-й гадзіне, увесь дзень у гаспадарчых клопатах, спакой прыходзіць толькі пасля 23 гадзін.



— Калі ўвечары ледзь жывы ўвалішся ў хату, міжволі мяркуеш, што трэба плюнуць і кінуць усё гэта, — прызнаецца Віктар Васільевіч. — Нават з жонкай палаемся: маўляў, давай усё здадзім і зажывём спакойна. Але раніцай прачнешся, адпачнеш — і пайшоў наноў...

Задавальненне ад жыцця — новыя аўтамабілі і гарадская кватэра, куды мяркуецца пераехаць бліжэй да цывілізацыі на схіле жыцця. Што ўбачылі ў вітрыне і захацелася, можна набыць. Не мяхамі, вядома ж, але пачаставацца можна.

— Можна, але ў нас такі ўзрост, што асабліва нічога і не хочацца, прынамсі з прысмакаў, — шчыра кажа Валянціна Аляксандраўна. — Ды мы часта і харчуемся на хаду. У сенакос не было часу ні гатаваць, ні есці.

У той час, калі гараджане з'язджаюць на адпачынак і на курортах пачынаецца высокі сезон, у Петушках, як і паўсюдна ў вёсцы, надыходзіць самая гарачая пара: збожжа, салома, бульба.

Водпуск ля мора Хадановічам не свеціць: у іх круглы год няма ні выхаднога, ні прахаднога. Можа, ім і па кішэні якія-небудзь Канары, але кінуць гаспадарку немагчыма.

— А нам і не хочацца, калі шчыра, — прызнаецца Віктар Васільевіч. — Я аднойчы ў жыцці паехаў па пуцёўцы ў Сочы, дык дні ў календары выкрэсліваў, нібыта ў войску. Не мог дачакацца, каб збегчы дадому! Там жа проста невыноснае гультайства!

### Карова і трактар — кармільцы

— Крызіс? — перапытвае Віктар Васільевіч у адказ на актуальнае пытанне. — Мяса і бульба па-ранейшаму карыстаюцца попытам. Адчулі бадай што ў новых патрабаваннях да малака: яны цяпер такія ж, як і да калгаснага. Тэмпература малака не павінна быць вышэйшай за 10 градусаў. Таму даводзіцца падымацца на гадзіну раней, даіць і потым ахалоджваць малако калодзежнай вадой, тэмпература якой 7 градусаў.

Хадановічы, па словах старшыні Комсеніцкага сельскага Савета Аляксея Рыбакова, першымі з гаспадароў справіліся з такімі сур'ёзнымі патрабаваннямі. Гаспадары кажуць, што дзяржава добра ставіцца да прыватных падворкаў. Цану на малако і датацыі пакінулі ранейшымі, нягледзячы на крызісныя з'явы. Ды і грошы за малако выплачваюць своечасова.

Але ад сёлета давядзецца плаціць падаткі з падсобнай гаспадаркі.

— З даходу звыш за 500 базавых велічынь трэба аддаць 12 %, — паведаміў інфармацыйна падкаваны Віктар Васільевіч. — Мы б і болей плацілі, калі б дзяржава нам давала працоўны стаж.

Стаж — гэта самая вялікая праблема для вяскоўцаў, якія займаюцца толькі падсобнай гаспадаркай і жывуць з яе. Віктар Васільевіч кажа, што часта чытае ў газетах пра намеры Урада даць такім гаспадарам, як ён і жонка, стаж за іх працу, але праблема так пакуль і не вырашана.

Яшчэ адно важнае пытанне — тэхніка. Натуральна, што Хадановічы апрацоўваюць зямлю і даглядаюць жывёлу не голымі рукамі, а з дапамогай тэхнікі. Даільны апарат, старэнькі трактар, нават невялікі камбайн. Усе гэтыя агрэгаты набытыя калісьці ў сельскіх гаспадарак і адпрацавалі шмат гадоў.

— Я ўзяў бы льготны крэдыт на развіццё падсобнай гаспадаркі, як плануе Урад, пад 5 % гадавых, — кажа Віктар Васільевіч. — Для таго, каб набыць новы трактар. Таму што трактар і карова заўсёды пракормяць вяскоўца. Альбо калі б з завода давалі гаспадарам тэхніку ў лізінг, напрыклад — з рэкамендацыі мясцовай улады. Вось тады падсобных гаспадарак у нас дакладна паболела б.

### Не катарга, але ўпартая праца

Пад смачны ягадны кампот і шыкоўныя цукеркі добра весці размову пра магчымасці бязбеднага жыцця ў вёсцы.

— Я памятаю 1970-я гады, калі стаў тут працаваць, — узгадаў старшыня сельскага Савета Аляксей Рыбакоў. — Тады таксама з неба не падала: лічы, яшчэ толькі пачалі вяскоўцам даваць за працу грошы. Але кожны, хто хацеў, мог набыць тэлевізар і халадзільнік. Можна было грошы сабраць, калі працаваць. І што самае важнае, працаваць штодзённа. Кожны дзень узнімацца на золку і забыцца пра лішняе спіртное.

— Так, мы памочнікаў наймаем толькі зрэдку, таму што часцей трэба іх саміх пасвіць, — падхоплівае гаспадар. — А наконт нашай працы, дык не падумайце, што гэта катарга. Проста вясковая праца сапраўды павінна быць упартай: штодня станавіся і рабі, што б ні здарылася. Але ў горадзе такіх магчымасцяў зарабіць няма, нават на падпрацоўках.

— І не забудзьцеся, што мы любім сваю працу, — сказала Валянціна Аляксандраўна. — Я ў горадзе і жыць не здолела б. Тут у нас здаровае жыццё на зямлі, чыстыя паветра і ежа. І каровы часам лепей за людзей: яны разумныя істоты і добра разумеюць чалавечую мову. Так што працу і родныя Петушкі не кінем, пакуль будуць сілы і здароўе.

**Ілона ІВАНОВА,** *Круглянскі раён.*

## НОВЫЯ ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

**Пра дадатковыя цягнікі Мінск — Мурманск і Мурманск — Мінск, прызначаныя Беларускай чыгункай для зручнасці пасажыраў на працягу ўсяго жніўня, мы ўжо паведамлялі раней.**

З гэтай жа мэтай у расклад руху ўведзены яшчэ некалькі цягнікоў. Гэта № 46 Мінск — Новасібірск адпраўленнем з Мінска 21 жніўня ў 16.04, прыбыццём у Новасібірск 24 жніўня ў 10.52, а таксама № 45 Новасібірск — Мінск адпраўленнем з Новасібірска 24 жніўня ў 18.58 і прыбыццём у Мінск 27 жніўня ў 12.01.

А для перавозкі пасажыраў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі ў цягніках № 4/3 Мінск — Масква, № 26/25 Мінск — Масква, № 100/99 Мінск — Сімферопаль, № 136/135 Мінск — Еўпаторыя курсіруюць па адным купэйным вагоне, якія прыстасаваныя для перавозкі пасажыра-інваліда і асобы, што суправаджае яго. Такія вагоны абсталяваныя пад'ёмнікамі, якія дазваляюць правесці пасадку калясачніка, унутры яны адаптаваны для камфортнага размяшчэння пасажыра з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Заўтра — дзень нараджэння нашай газеты**

# «ЗВЯЗДА» ВУЧЫЦЬ ЛЮБІЦЬ СВАЮ КРАІНУ»

**Гістарычны вопыт паказвае, што рысы цяперашняга фарміруюцца ў мінулым, там жа закладваюцца перадумовы руху наперад, у будучыню. Менавіта гэтым прадыктавана патрэба вывучэння і беражлівых адносінаў да гісторыі сваёй краіны. Летапісцам гісторыі з'яўляюцца нашы беларускія газеты. На мой погляд, у гэтым шэрагу першынство належыць газеце «Мужыцкая праўда» (1862—1863 г.), выйшла 7 нумароў. Гэта першая на беларускай мове газета (друкавалася лацінкаю), якую выдаваў К. Каліноўскі з Ф. Ражанскім і В. Урублеўскім. Кожны нумар падпісваўся псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні». Газета заклікала беларускі народ да барацьбы супраць прыгонніцкага ладу, нагадваючы пра тое агульнае, што было ў становішчы беларускага, рускага і польскага народаў.**

Не меней важнае месца ў жыцці беларускага народа належыць «Нашай Ніве» — штотыднёвай грамадска-палітычнай, навукова-асветніцкай і літаратурна-мастацкай газеце. Выдавалася з лістапада 1906 г. да жніўня 1915 г. у Вільні на беларускай мове. У газеце супрацоўнічалі пісьменнікі і публіцысты ліберальна-дэмакратычнага, радыкальна-рэвалюцыйных і сацыял-дэмакратычных поглядаў, іх аб'ядноўвалі ідэі дзяржаўна-палітычнага і нацыянальна-культурнага самавызначэння беларускага народа. У яе асяроддзі фарміравалася ідэя суверэннай Беларусі.

Газета праўдзіва адлюстроўвала ўсе элементы народнага жыцця, паспрыяла развіццю беларускай нацыі, яе мовы, грамадска-палітычнай, філасофскай і эстэтычнай думкі.

У ёй супрацоўнічалі Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Цётка, Алесь Гарун, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі і іншыя пісьменнікі, якія стварылі беларускую класічную літаратуру.

Лепшыя традыцыі гэтых выданняў трэба не толькі вывучаць, але і сёння выкарыстоўваць для павышэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, для захавання гістарычнай спадчыны, культуры і роднай мовы, для павышэння дабрабыту людзей і захавання згоды ў грамадстве. Для выканання гэтай задачы лёс, на маю думку, прызначыў газету «Звязда». Выпісваю яе дзесяцігоддзямі і бачу, як цэлыя пакаленні журналістаў разам з чытачамі працягваюць лепшыя традыцыі, закладзеныя папярэднікамі.

З газетай «Звязда» ў мяне даўнія сувязі, і сёння я з'яўляюся яе падпісчыкам, таму што яна беларускамоўная і самая аб'ектыўная газета.

З 1964 па 1975 год я працаваў старшынёй калгаса імя Жданава (цяпер — вёска Ізабелін) Ваўкавыскага раёна. Неяк да нас у калгас прыехаў карэспандэнт газеты «Звязда» паэт Віктар Шымук, жонка якога была мясцовай ураджэнкай. Мы пазнаёміліся з ім і нават пасябравалі. Але калі ён запытаў у мяне, колькі чалавек у калгасе выпісваюць «Звязду», я не змог адказаць. Я звярнуўся з гэтым пытаннем да калгаснага актыву. Адказ быў несуцяшальны. І мы вырашылі падпіскай «Звязды» дадаткова прэміяваць перадавікоў калгаса, а актыву падпісацца самім. Вынікам стала тое, што ў нашым калгасе падпісчыкаў «Звязды» стала каля сотні. За гэта рэдакцыя газеты «Звязда» ўзнагародзіла мяне ганаровай граматай і кніжкай «Наша «Звязда», што выйшла да 50-годдзя газеты. Задаволенымі засталіся і нашы людзі. Вось такім было маё стаўленне да газеты на роднай мове ў тыя далёкія часы.

Дарэчы, светлая памяць пра Віктара Шымука захаваецца ў маім сэрцы назаўсёды. Ён вельмі любіў мясціны вакол Ізабеліна. Ізабелінскі лес, ад калгасных палёў бярозавы гай, далей стары бор, а побач маладыя дубровы і арэшнікі. Аднойчы, у аўсянае жніво, мы заехалі ў арэшнік. Быў ураджайны год — было многа арэхаў. Вось я яму паведаміў, што плануем гэты арэшнік выкарчаваць, правесці культуртэхнічныя работы і гэты ўчастак прылучыць да палеткаў калгаса. Ён вельмі абурыўся і сказаў: «Міхась, ты што? Калі ты гэта зробіш, я перастану цябе паважаць». Арэшнік застаўся. Віктар быў вясёлым чалавекам, граў цудоўна на акардыёне і меў добры голас, спяваў са сваёй цешчай. Не раз запрашаў мяне ў Мінск. Аднойчы выдалася нагода і я прыехаў у Мінск, зайшоў у рэдакцыю газеты. Ён пазнаёміў мяне з вельмі цікавым супрацоўнікам газеты «Звязда» Алесем Траяноўскім, які падарыў мне кніжку «Там, дзе Шпрэвя шуміць» з надпісам: «Міхасю Жэбраку — у дзень першага знаёмства, чалавеку, якога я палюбіў, і, дай Божа, каб сустрэча не была апошняй».

*Шчыра Алесь Траяноўскі.*
27.III—1971 г.»

> ***Усіх нас павінен аб'ядноўваць галоўны клопат — клопат за незалежнасць і заможнасць нашай краіны.*** ”

Віктар Шымук і Алесь Траяноўскі былі шчырымі прыхільнікамі беларускай мовы, сапраўдныя сыны нашай Бацькаўшчыны.

Лічу, што кожны, хто жыве на нашай зямлі, павінен хвалявацца за лёс Беларусі, помніць запаветы тых, хто аддаў жыццё за тое, каб Беларусь была вольнай. Трэба ведаць сваю сапраўдную гісторыю, нацыянальную культуру, любіць і шанаваць сваю маці-мову, каб ляжалі на рабочым стале кнігі нашых беларускіх асветнікаў і пісьменнікаў. Усім набрацца мужнасці, адмовіцца ад усялякіх уласных амбіцый, пазбавіцца так званага віруса фанабэрыстасці, і ў такім выпадку яшчэ ёсць надзея на наша выратаванне, на захаванне нашай суверэннай краіны, нашага этнасу. Як і сто гадоў таму, цяпер нам вельмі патрэбна яскравае ўсведамленне нашага месца ў гэтым свеце. Гэтаму дапаможа газета «Звязда» — я ўпэўнены.

Працэс нацыянальнага адраджэння — глабальны, яго можна замарудзіць, а назад павярнуць ужо нельга. Яўрэі праз дзве тысячы гадоў адрадзілі іўрыт — ужо мёртвую мову. Дык няўжо мы, беларусы, дазволім загінуць жывой? Упэўнены: пройдуць дзесяцігоддзі, і наша мова верне сабе свае правы, што ёй належаць ад прыроды, ад гісторыі!

Нарэшце, усе мы павінны зразумець — улада, апазіцыя, дэпутаты, чыноўнікі, бюракраты, анархісты, сацыялісты, спецыялісты і проста грамадзяне нашай краіны, — што не гарматы ці танкі, нават не міждзяржаўныя саюзы або нешта іншае, а толькі родная мова ёсць адзіны і дзейсны абярэг Беларусі. На тое і існуе дзяржава, каб бараніць нацыянальныя інтарэсы.

І гэтае пачуццё нарастае ў першую чаргу ў моладзі. Я ўсё часцей чую беларускую гаворку маладых людзей, гараджанаў, і гэта дае надзею.

Мы хочам заставацца самі сабою, са сваімі традыцыямі. Хочам развівацца далей, набываць тое, што назапашана ў свеце. Гэта можа вызначыць дзяржаўная палітыка.

29 лістапада 2008 года газета «Звязда» надрукавала інтэрв'ю з праваслаўным святаром Ігуменам Савам (Мажукам). Скажу шчыра — мяне гэта ўзрадавала і ўсхвалявала. Цалкам падтрымліваю яго разважанні: «І зусім па-іншаму, па-сапраўднаму, па-беларуску і вельмі прыгожа, цёпла, мякка і зразліва размаўлялі артысты і дыктары на радыё ў савецкія часы». І далей: «...трэба памятаць, што без захавання свайго твару мы ў акіяне глабалізацыі можам страціць спачатку культуру, а потым і дзяржаўнасць». Дык вось, я з вялікай надзеяй чакаю таго часу, калі пасол заходняй дзяржавы будзе гаварыць па-беларуску, а карэспандэнт Белтэлебачання не будзе задаваць яму пытанні на рускай мове.

8 красавіка 2009 года газета «Звязда» надрукавала артыкул «Спадарыня... Дазвольце ёй застацца!». Абедзве гэтыя публікацыі выклікалі вялікі рэзананс, а праблема так і застаецца. Шкада, аднак пакуль родная мова многіх прадстаўнікоў улады не цікавіць.

Якія захады трэба зрабіць, каб беларуская мова заняла сваё належнае месца ў грамадстве? На маю думку, па-першае, прыняць дапаўненні да Закона аб дзяржаўнай службе: усе чыноўнікі павінны ведаць дзве мовы — беларускую і рускую. Прыняць экзамен ад іх, па выніках якога рабіць выснову аб далейшым лёсе кожнага.

Па-другое, — прыняць рашэнне аб мерапрыемствах па беларусізацыі і паступова, але настойліва яго выконваць. Так мы зможам выхаваць грамадзян, сапраўдных патрыётаў, якія будуць мець нацыянальны грунт і дух, ведаць сваю культуру і гісторыю! Пакідаючы пэўную нішу для рускай мовы, актыўна рухацца да роднай мовы! Ну хто ж за нас гэта зробіць?

Найвялікшая каштоўнасць, якую мы атрымалі, — гэта суверэнная і незалежная Беларусь. Цяпер перад намі дзве задачы:

1) захаваць нашу самастойнасць — суверэнітэт Беларусі і забяспечыць дабрабыт яе народа;

2) па-сапраўднаму ўзяцца за адраджэнне роднай мовы, культуры і гісторыі, нашай спадчыны. Усё астатняе, у тым ліку барацьба за ўладу, — гэта справа другарадная. Улада і апазіцыя павінны плённа працаваць па развіцці эканомікі і павышэнні нацыянальнай самасвядомасці грамадзян нашай краіны. Нам патрэбен свой шлях, заснаваны на прыярытэце нацыянальных інтарэсаў, не адвяргаючы супрацоўніцтва ні з Расіяй, ні з Захадам. Калі будзе захоўвацца наша дзяржава, то і мы, беларусы, захаваемся як нацыя.

**Міхась ЖЭБРАК.**

---

**Купляй сваё — жыві лепш!**

# НЕ ЎСЁ ЗОЛАТА, ШТО БЛІШЧЫЦЬ

***Купляючы тавар, трэба думаць і пра запчасткі***

**У кастрычніку 2007 года гродзенец Уладзімір купіў для свайго дачнага дома імпартны электраводанагравальнік. Пры гэтым ён не надта цікавіўся запчасткамі, дакладней, іх наяўнасцю на мясцовым рынку, не разабраўся адразу і ў гарантыйных умовах эксплуатацыі. Прывабіла яго найперш тое, што непасрэдна на баку воданагравальніка быў яскрава, вялікімі літарамі чырвонага колеру пазначаны тэрмін гарантыі — тры гады. Аднак, як кажуць, не ўсё золата, што блішчыць.**

У дакументацыі на гэты тавар канкрэтызуецца, што трохгадовы гарантыйны тэрмін эксплуатацыі датычыцца не ўсяго электрапрыбора, а толькі водазмяшчальнай ёмістасці (бака). А гарантыя для элементаў электрычнай часткі — дванаццаць месяцаў.

Гэты нюанс стаў для Уладзіміра актуальным нядаўна, калі вось гэты элемент (тэн) выйшаў са строю і спатрэбілася яго замена. Паколькі гадавая гарантыя на той момант ужо скончылася, то, зразумела, запчастку трэба было набываць за свае грошы. Уладзімір і не супраць. Але дзе гэты тэн купіць? Спроба вырашыць праблему самастойна была марнай: высветлілася, што запасныя часткі на электраводанагравальнік гэтай маркі ў Гродне... не прадаюцца. Няўжо ехаць у Санкт-Пецярбург, дзе іх вырабляюць?

Але ж у абласным цэнтры працуе рэгіянальны прадстаўнік фірмы, якая гандлюе гэтым таварам. Да яго Уладзімір і звярнуўся з просьбай прадаць тэн. Аднак і гэта, здавалася б, элементарнае пытанне, аказалася няпростым. Заплаціць грошы і забраць запчастку... нельга, паколькі яе вам павінен устанавіць спецыяліст па сэрвісным абслугоўванні з адпаведнай ліцэнзіяй. Дзякуй, безумоўна, за магчымасць скарыстацца такой паслугай. Але чаму яна павінна быць безальтэрнатыўнай? Чаму пакупнік, ужо не маючы ніякіх гарантыйных «прывілеяў», тым не менш у пытанні набыцця запчасткі ўсё адно «прывязаны» да пасрэдніка, які, зразумела, працуе зусім не на дабрачынных прынцыпах? Няўжо ў гэтай сітуацыі не сам кліент павінен вырашаць, якому варыянту аддаць перавагу: запрашаць спецыяліста па сэрвісе альбо купіць тэн і ўзяць на сябе яго ўстаноўку?

У рэшце рэшт тэн Уладзіміру ўсё ж прадалі, пайшлі, так бы мовіць, насустрач. «Але хіба ж гэта павінна быць выключэннем з правілаў?» — задаецца пытаннем чытач «Звязды».

Такое пытанне мы неўзабаве абмеркавалі з Яўгенам Маёравым, рэгіянальным прадстаўніком мінскай фірмы, якая гандлюе электраводанагравальнікамі гэтай маркі. Паводле яго слоў, у перспектыве мяркуецца наладзіць пастаўку і продаж камплектавых частак, адпаведныя перамовы быццам вядуцца з прадпрыемствам-вытворцам гэтых электраводанагравальнікаў у Санкт-Пецярбургу. Аднак новай рэдакцыяй беларускага Закона аб абароне правоў спажыўцоў не ў перспектыве, а ўжо сёння вызначана дакладная норма: «Вытворца (пастаўшчык) абавязаны забяспечыць не толькі рамонт і абслугоўванне ўвезенага тэхнічна складанага тавару, але таксама і выпуск і пастаўку запасных частак у гандлёвыя і рамонтныя арганізацыі ў неабходных аб'ёмах і асартыменце на працягу тэрміну службы тавару, а пры адсутнасці такога тэрміну — на працягу дзесяці гадоў з дня продажу».

Дарэчы, Яўген Маёраў зазначыў, што не толькі яго фірма пакуль не забяспечвае запчасткамі гандлёвую сетку Прынёманскага рэгіёну. Маўляў, паслугі па іх пастаўцы і продажы на сёння не робяць у абласным цэнтры і іншыя фірмы, якія гандлююць электраводанагравальнікамі. Ну і аргумент... Вось бы з гордасцю сказаць, што канкурэнты гэтага не робяць, а мы здолелі! А тут — «мы, як і ўсе, гэтага не робім».

Зрэшты, не ўсе. Літаральна праз паўгадзіны пасля гэтай гутаркі мы з Уладзімірам убачылі ў рознічным продажы і тэны, і іншыя запчасткі да электраводанагравальнікаў. Іх прапануе ў горадзе над Нёманам фірмовая крама нашага айчыннага вытворцы, ААТ «Гродгандальмаш». Прадавец Руслан Пятроў мог тут жа аформіць пакупку таго ж тэна, даючы, але не навязваючы магчымасці яго ўстаноўкі спецыялістам. А ўмовы гарантыйнага абслугоўвання на гродзенскія электраводанагравальнікі нават лепшыя, чым у вышэйзгаданым выпадку. Мяркуйце самі: гарантыя для элементаў электрычнай часткі — таксама 12 месяцаў, а вось на бак — не тры, а ажно сем гадоў.

Цяпер Уладзімір можа пашкадаваць, што не аддаў перавагу менавіта айчыннай прадукцыі. Тым больш што яна не прайграе імпартнай ні па цэнасным фактары, ні, як сведчыць вопыт ягонага суседа па дачы, па якасці.

Але, разам з тым, узнікае наступнае пытанне: а ці шмат намаганняў прыкладае айчынны вытворца, каб схіліць на свой бок кліентаў? Хіба ж, як кажуць, на слыху інфармацыя пра вышэйзгаданыя перавагі гродзенскіх электраводанагравальнікаў? Ды і ў звычайнай, а не фірмовай краме, як пераканаўся карэспандэнт «Звязды», выглядаюць яны, так бы мовіць, даволі сціпла. Стандартная таблічка «Зроблена ў Беларусі» і абсалютна нічога пра ўмовы гарантыйнага абслугоўвання і набыцця запчастак. А па суседстве — канкурэнтны імпартны тавар з прывабнай этыкеткай пра еўрапейскае лідарства...

Для параўнання — два прыклады на тэму, скажам так, прасоўвання тавару ў шырокія і нават у не надта шырокія народныя масы. Абодва — з маёй паштовай скрынкі. У першым выпадку індывідуальны прадпрымальнік не паленаваўся знайсці адрас карэспандэнцкага пункта «Звязды» ў Гродне (і, пэўна, не толькі яго) і прапанаваў свае паслугі па «запраўцы картрыджаў і абслугоўванні офіснай аргтэхнікі з выездам да кліента». У другім — патэнцыяльных пакупнікоў спрабавала зацікавіць адна з буйных крамаў. Прычым не проста заклікам купляць у іх, а супаставіўшы з цэнамі ў іншых крамах «вашага раёна» і прывёўшы лічбы магчымай эканоміі грошай з пакупніцкага кашалька.

А пра перавагі гродзенскага электраводанагравальніка ўдалося даведацца толькі тады, калі адзін з нашых чытачоў «апёкся» на імпартным...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

---


## ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

**проводит 25 сентября 2009 г. аукцион по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

**ЛОТ № 1**

**Капитальные строения (здание склада ГО и склада запасных частей), инв. № 340/С-27553 и инв. № 340/С-27552 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** склад запасных частей – здание кирпичное одноэтажное, общей площадью 62,7 кв.м, кровля – шиферная, год постройки 1947; склад ГО – здание кирпичное двухэтажное, общей площадью 354,6 кв.м, кровля – шиферная, год постройки 1964.

**Местонахождение:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Василевичи.

**Условия использования** – для размещения объектов производственного назначения.

**Земельные участки – 0,0565 га.** (№ 1 – 0,0454 га и № 2 – 0,0111 га). **Срок аренды земельных участков 55 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 43 104 319** рублей, в т.ч. имущества – **42 658 341** рубль, права заключения договора аренды земельных участков – **445 978** рублей.

**Задаток, вносимый участником, – 4 000 000** рублей.

**Продавец:** имущества – транспортное республиканское унитарное предприятие «Гомельское отделение Белорусской железной дороги», тел. (0232) 95 42 96; права заключения договора аренды земельного участка – Речицкий райисполком, тел. (02340) 2 34 61.

**ЛОТ № 2**

**Капитальное строение (сварочный цех), инв. № 330/С-7975; капитальное строение (механический цех), инв. № 330/С-7974; материально-технический склад (арочный), инв. № 330/С-7972; гараж, инв. № 330/С-7971; здание электроцеха, инв. № 330/С-7973; здание административного корпуса (контора РПЦ), инв. № 330/С-8155; железобетонная дорога, инв. № 330/С-1469; электрическая сеть, инв. № 330/С-5443; канализация (хозфекальная сеть), инв. № 330/С-5455; тепловая сеть, инв. № 330/С-5459; водопроводная сеть, инв. № 330/С-5461; и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Местонахождение:** Гомельская область, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 91.

**Условия использования** – для производственной базы.

**Земельный участок – 3,1101 га. Срок аренды земельного участка 50 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 1 766 435 264 руб.**, в т.ч. имущества – **1 203 013 130 руб.** (снижена на 20 %), право заключения договора аренды земельного участка – **563 422 134 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **104 437 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 150 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – геологоразведочное республиканское унитарное предприятие «Белгеология», г. Минск, ул. Некрасова, 7, тел. (02351)765 95; права заключения договора аренды земельного участка – Мозырский райисполком, г. Мозырь, ул. Ленина, 16, тел. (02351)298 83.

**ЛОТ № 3**

**Капитальное строение (здание отделения почтовой связи) инв. № 321/С-9369 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** здание одноэтажное бревенчатое, общей пл. 65,5 кв.м., перекрытия – деревянные, год постройки – 1973.

**Местонахождение:** Гомельская область, Буда-Кошелевский район, агрогородок Дуравичи, ул. Советская, 29.

**Условия использования** – по целевому назначению или для социально-гарантированного обслуживания населения.

**Земельный участок – 0,0483 га. Срок аренды земельного участка 50 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 11 520 944 руб.**, в т.ч. имущества – **11 515 734 руб.**, право заключения договора аренды земельного участка – **5 210 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 1 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. (0232) 79 67 14; права заключения договора аренды земельного участка – Буда-Кошелевский районный исполнительный комитет, тел. (02336) 2 15 60.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», **г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны (0232) 70 14 72, 74 90 27.**

Аукцион проводится **25 сентября 2009 г. в 11.30 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 23 сентября 2009 г.** заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на счет организатора аукциона, указанный в извещении; копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» № 3642927330048 в филиале № 300 АСБ «Беларусбанк» г. Гомель, код МФО 151501661, УНН 400243904. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», ком. 406, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням по 23 сентября 2009 г. включительно.

Заключительная регистрация участников 25 сентября 2009 г. с 10.00 до 11.15.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, с ним продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Гомельского облисполкома: www.gomel-region.by, и сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: www.gki.gov.by.


---

**Простая мова**

**...Прэзентуючы гэтую рубрыку (без малога восем гадоў таму), пісала, што ў жанчын так часта бывае — любяць адных, жывуць — з другімі. І што мне ў гэтым сэнсе пашчасціла... А вось з працай — менш: шчыравала ў іншых газетах, а чакала і чытала найперш «Звязду». Даслоўна: «Цяпер — пішу. І нават верыць хачу, што гэта — надоўга, што прыме патрабавальны звяздоўскі чытач маю «простую мову».**

**У тым, што прыняў (хай, магчыма, і не кожны!) сумневу даўно няма. Ёсць — светлае жаданне на дзень народзінаў газеты падараваць яму «букет» — з чарговых абразкоў.**

# КАЛІ ЦВІТУЦЬ ЦЮЛЬПАНЫ

### МЫ БУЛЬБАШЫ...

Мінск патанае ў кветках.

Гучыць гэта, вядома ж, загучна, але праўда ў словах ёсць, бо імі — знаёмымі і незнаёмымі, вядомымі і невядомымі — упрыгожаны вуліцы, плошчы і скверы, імі абсаджаны подступы да ўсіх прадпрыемстваў-устаноў, яны, найперш, вітаюць кліентаў у банках, цырульнях і крамах, ад іх святлеюць двары.

У суседнім вось клумба прывабіла — нечым незвычайным, бэзава-белым...

Вачам не паверыла — бульба! Ды такая спраўная — ні жука на ёй, ні фітафторы якой! Кусцікі — хоць на выставу!

Хто ж вырасціў, як такая думка ў голаў прыйшла, — застаецца толькі здагадвацца. Мо напрадвесні купіў хто мяшок, у кватэру нёс ды рассыпаў (а дурэючы хтосьці клубні ў клумбу ўваткнуў)? Ці наадварот — вынесіў — звялую-праросную і пашкадаваў потым выкінуць?.. А мо старэнькі хто спецыяльна пасадзіў, каб яшчэ раз убачыць, як жа хораша цвіце, і падумаць, ці вялікая вырасце, ці смачная, панепакоіцца аб тым, хто ўбярэ і калі — той, хто садзіў? І тады, як счэзне бульбоўнік, ці да часу, п'янчужка які, на закусь?

...Хоць ахову да клумбы прыстаў!

Для таго, каб сабраць нечаканы ўраджай, каб захаваць і каб налета — зноўку пасадзіць. Ужо на многіх клумбах! На пацеху.

### ПАД ВАДОЙ

Сына Алёна гадуе адна і ні на што не скардзіцца. Ну хіба па драбязе — на тое, што лёгка прывучыўшы дзіця да гаршка, не можа ніяк адвучыць?! Ладны ўжо, а захоча — хай па маленькай патрэбе — дзвюма ручкамі штонікі ўніз (ледзь не да костачак) — і садзіцца...

Гаварыла яму, і не раз, што гэта — не абавязкова, што трэба ўжо стоячы... Марна ўсё!

Добра, сваяк у госці заехаў... Падгадаў неяк час, узяў малога за ручку, завёў у патрэбнае месца — разам, удваіх, «пастаялі», і дзіця такое ж гордае было, што ўмее — вось так, «па-даросламу»...

Праўда і на жаль — не ўсё.

У суботу вось яны на рэчку пайшлі, размясціліся (непадалёк потым — кампанія хлапцоў), загаралі, купаліся. Потым малы па звычцы трусікі ўніз (абедзвюма ручкамі) — і на ўвесь пляж:

— Мама, а дзе тут можна пі-пі?.

Тая хуценька завяла — у першы раз... У другі — хлопчык ужо сам пабег... Трусы на каленках... Суседзі аж зайшліся ад рогату...

— З каго?! З чаго?! Што вы тут смешнага ўбачылі? — кінулася ў наступ маці. — Дзіця — двухгадовае — у туалет бегае, ведае, куды трэба, а вы?!... Бэйбусы няшчасныя! Вядро піва выпілі і ў той бок — ні нагой. Усё плаваць ходзіце... Думаеце, не бачыць ніхто... Не ведае?

...Факт: вочы — у тым ліку на вельмі і вельмі многае — нам адкрываюць маці. Калі не свае, то чужыя.

Толькі б не позна...

### СУЦЯШЭННЕ

Гастраном — чарга ля касы. Наперадзе — дзяўчо з заплечнікам. На ім — вялікі значок з надпісам: «Торможу без предупреждения»... Гэта — пра мяне. Добра было б купіць. І прычапіць. Каб ведалі...

Як, між іншым, і тое, што «Торможение — тоже движение!»

### БЕЗ ВІНЫ

...Раніца, вуліца. І не сказаць жа, што падбегам ішла, што дужа засяроджанай, а мужык з-за вугла, як чорт з табакеркі выскачыў — насустрач, з цыгарэтай... Ды такой смярдзючай, — міжволі скрывілася.

Ён заўважыў. Я — запрабачалася.

І толькі потым падумала, а ці трэба было? Мо курцы павінны такі ведаць, што ад іх (у абсалютнай бальшыні і яшчэ мякка кажучы) непрыемна пахне?..

І, можа, гэта яны мусяць прабачацца? Перад дзецьмі, перад цяжарнымі і проста жанчынамі, перад хворымі...

Не з-за іх?

### ФАКТАР РЫЗЫКІ

...Рэпартаж той пісаўся ў нумар і быў, лічы, гатовы (заставалася — перачытаць-падпісаць, хто на здымку), калі пазваніла прыяцелька і непазнавальным голасам сказала, што ў яе... прапала дзіця: тры гадзіны таму пайшло ў краму па хлеб... Пайшло і дагэтуль няма. Яны ўжо ўсіх абзванілі... І ўсё аббегалі. Што рабіць? — пыталася жанчына.

Паспрабавала крыху супакоіць, нешта параіла, паабяцала, што вось зараз здам рэпартаж і прыеду...

Лёгка было абяцаць, а рабіць...

Думкі і радкі сталі блытацца, словы «не ішлі», у галаву, як заўсёды ў падобных выпадках, лезла самае горшае — мне... Што ўжо казаць пра маці?!

Але ж дапісала. Здала і паехала.

На палове дарогі спыніў мабільнік — знайшлося дзіця!.. І камень з душы...

Вярнулася назад на працу — у рэпартажы, што пісаўся ў нумар, былі памылкі. Іх далёка не кожны б заўважыў, з-за іх ніхто б не пацярпеў. І тым не менш...

Стан, пры якім, хай на імгненні, але траціцца кантроль, з лёгкай рукі лётчыкаў, авіядыспетчараў і г.д., называецца чалавечым фактарам.

Кажуць, менавіта з-за яго людзі адмаўляюцца ад розных небяспечных праектаў...

Я ж пакуль — заўсёды баюся, калі звініць мабільнік у вадзіцеля тралейбуса — хто яго ведае, што яму скажуць. І як ён успрыме?

### У КОЖНАЙ ШАФЕ...

Дамоў, ад сваёй лепшай сяброўкі Іванаўна ў той вечар ледзьве прыпаўзла.

А туды ж — ляцела ж на крылах!

Яшчэ б: яе былая студэнтка (гадоў з 20 у Штатах жыве) папрасіла дапамагчы — знайсці жанчыну, якая згадзілася б прыглядаць за яе не старым яшчэ і не хворым бацькам, гэта значыць, званіць яму і, калі той папросіць, на якую гадзінку прыязджаць — можа, нешта есці зрабіць ці прыбраць, папрасаваць, дапамагчы што з дачы спарадкаваць... Само сабой — калі раптам занядужыць — побач пабыць. І за гэта, штомесяц, атрымліваць зарплату ў... 300 долараў ЗША!

— Верачка, мілая! — «не трымаючы» эмоцый казала Іванаўна сваёй сяброўцы, — я за цябе паручылася, я ім расказала, што ты разумная, добрая, клапатлівая... Што ты — проста цудоўная гаспадыня... І, нябось, забылася ўжо, калі гатавала нешта прыстойнае? Нябось забылася, калі прыбірала ў людскім доме... Верачка, ты ж хоць душу там адвядзеш: занятак будзеш мець... І грошы? 300 долараў! Ды іх — ты ж ведаеш — не ўсім выкладчыкам сёння даюць! Звані, згаджайся! Хоць зажывеш — прыадзенешся крыху, абутак купіш... Гэта твой шанц, разумееш?!.

Ад яго — і цалкам жа рэальнага! — вочы ў Веры спярша загарэліся. І... гэтак жа хутка патухлі, бо куды ёй з падводнай лодкі?! Два сыны. Абодва п'яніцы. Але на матчыну пенсію яшчэ не дужа разгоняцца, таму працуюць і хоць трохі трымаюцца. А ўладкуецца на працу яна — усё, кінуць. І пазахлынаюцца ж, п'ючы!... Альбо пазабіваюцца... Таму ёй — з дому — нельга, ні нагой. Як-ніяк — маці... Дзе крыкам, дзе плачам — ратуе. І будзе... Пакуль жывая...

Дамоў ад сваёй лепшай сяброўкі Іванаўна ледзь прыпаўзла. А туды ж — ляцела на крылах.

У кожнай шафе — свой шкілет. У кожнай сям'і сваё пекла.

### КОЖНАЙ СЯСТРЫЦЫ ПА ЗАВУШНІЦЫ?

З мультфільма: «Мы строили-строили и наконец построили». З жыцця: мы ехалі-ехалі і такі ж прыехалі:

— Троллейбус дальше не пойдет! — гучна аб'явіў кіроўца між двума прыпынкамі.

Пасажыры — пераважна моўчкі — падаліся да выхаду. Але не ўсе: «меншая палова» засталася — стала пытацца, а што зрабілася, ці надоўга рамонт?..

Яно і зразумела: людзі аплацілі праезд, разлічвалі дабрацца, яны не вінаватыя, што нешта зламалася ў гэтым тралейбусе. А ў іншы зойдзеш, — і зноўку плаці: каму што раскажаш?

Зрэшты, расказаць цяпер ёсць каму: гаспадарамі па салонах ходзяць кандуктары.

— Што ў вас за праезд? — пытае ў кожнага мажная кабета.

Нехта ў адказ ёй паслухмяна дастае праязны, нехта — хоць-нехаць купляе білецік.

— Нічога, — буркае побач вялікі баўдзелаваты бомж.

— А чаму гэта?! — строга пытае жанчына.

— Мне адзін прыпынак, — кідае той, з надзеяй, відаць, што адчэпіцца. Ды не на тую напаў, як кажуць!

— Пехатой тады ідзі, — смела наступае на яго кабета. — А сеў ехаць, значыць, плаці!

— А колькі тут трэба плаціць? — цікавіцца раптам яго сябрук, відаць, яўна заахвочаны тым, што і іх вось палічылі за людзей, падышлі ды нешта гавораць...

— Шэсцьсот рублёў... З дваіх — тысячу дзвесце! — патрабуе кандуктарка.

Твары ў мужыкоў (яшчэ мякка кажучы!) здзіўлена выцягваюцца, бо капейка якая (калі яна ёсць?), то выключна ж на святое — гэта значыць, на віно ці гарэлку, «выкінуць» яе на праезд... Ды лягчэй самім...

Прыпынак якраз, дзверы ў тралейбусе адчыняюцца, і бамжы «выкідваюцца», выходзяць. Кандуктарка ж, «завёўшыся», яшчэ доўга крычыць, што з-за гэтых вось розных неплацельшчыкаў на зарплату грошай няма, што будзь яе воля, яна б усіх зайцоў, а тым болей вось гэтакіх, «у некую арудзію», каб свет не паскудзілі, што з-за іх...

Пад гэты цалкам заканамерны крык успамінаецца зусім, здавалася б, недарэчнае — з паўгода таму ўбачаны дакументальны фільм пра замахі на жыццё Гітлера. Адзін з іх, з гэтых замахаў, спланаваў студэнт. І апынуўся ўжо ў патрэбным месцы, у патрэбны час, і страляць, як быццам, умеў. Аднак — нібы чорт які ахоўваў фюрэра: ён павінен быў прайсці першым і ў цэнтры, а пайшоў збоку і паводдаль ...

Страляць туды сэнсу не мела, і замах быў адкладзены. Студэнт паехаў дамоў — зайцам і яго затрымалі, мусіць, такія ж пільныя прынцыповыя кандуктары, завялі ў пастарунак, дзе, прынамсі, і высветлілася, што ні білета, ні грошай у хлопца няма, а вось зброя ёсць. Ён нават шчыра сказаў, для чаго...

Як і трэба было чакаць, хлопца, «злачынцу», судзілі і, як кажуць, мала не далі — пазбавілі жыцця. А сапраўдны злачынца застаўся жыць і распачаў-такі Другую сусветную вайну, наступствы якой крывавяць да сёння.

Таму Гітлера (хай і ў лаўрах Герастрата) помніць ці не ўвесь свет.

Імя таго студэнта — магчыма — гісторыкі. Суддзяў і кандуктара — аніхто.

### КАЛІ ЦВІТУЦЬ ЦЮЛЬПАНЫ

У кнігарні забягаю зрэдку — нешта пэўнае ўзяць, на хвілінку. Выходжу — праз гадзіну і не раней, бо там не за тое, дык за гэта, а вокам зачэпішся.

Узімку неяк кніжку разгарнула, прачытала толькі абзац (герой некаму расказваў, як жонка яго нарадзіла сынка і як ён тады ўсе клумбы абрэзаў — з гладыёлусамі і... цюльпанамі).

Цюльпаны (прынамсі тады) цвілі выключна вясной, гладыёлусы — у канцы жніўня.

Не дараваўшы аўтару вось гэтай «маленькай хлусні», кніжку купляць не стала.

А вось прачытаць — давялося: сябрук параіў. Меў рацыю — цікавая кніжка, патрэбная.

Іх, непатрэбных, і насамрэч, відаць, не бывае? Нават цяпер.

**Валянціна ДОЎНАР.**

---

**ЛІТАРАльная гісторыя**

## У ГОРКАХ СЛАБА ВУЧАЦЬ БЯЗБОЖНІКАЎ, «ДВАРЭЦ» ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ЗБОЖЖА, КАМСАМОЛЬЦЫ ВАНДРУЮЦЬ ПА ДНЯПРЫ, А Ў ЛОЕВЕ ПРЫЗЯМЛІЎСЯ САМАЛЁТ ЧЫРВОНАГА КРЫЖА...

*Разам з чытачамі гартаем старыя жнівеньскія падшыўкі «Звязды».*

**1 жніўня 1928 года. ГОРКІ. (Уласны карэспандэнт.)** «Адбылася раённая канферэнцыя бязбожнікаў. На канферэнцыі прысутнічала каля 100 чалавек. Удзельнікі канферэнцыі зазначылі, што ячэек бязбожнікаў у раёне вельмі мала, а дзе яны ёсць, дык імі дрэнна кіруюць. Вясковае настаўніцтва, камсамольцы і партыйныя ячэйкі амаль зусім не праводзяць працы з насельніцтвам на антырэлігійныя тэмы».

**БАБРУЙСК. (Ад нашага селькора.)** «На млыне саўгаса «Дварэц» Бабруйскай акругі супрацоўнікамі саўгаса на працягу двух год раскрадалася сялянскае збожжа, якое прывозілася для памолу. Супрацоўнікі саўгаса кожны дзень патаемным ходам кралі муку і прадавалі яе дзесяткамі пудоў прыватніку... У саўгасе поўным гаспадаром з'яўляецца бухгалтар, ён жа і касір. Кіраўнік саўгаса п'янствуе, у часе 10-й гадавіны яму разбілі твар».

**5 жніўня 1935.** «2 жніўня самалёт паветранай станцыі хуткай дапамогі Чырвонага крыжа вылецеў у Глускі раён, куды даставіў хірурга Бобрыка. На працягу двух дзён Бобрык прыняў 90 хворых, пераважна калгаснікаў, і зрабіў 4 аперацыі... У жніўні самалёт Чырвонага крыжа абслужыць 28 раёнаў БССР».

**РАГАЧОЎ, 4 жніўня. (Спец. Кар. «Звязды».)** «Учора камсамольцы-асводаўцы, удзельнікі шлюпачнага паходу Магілёў — Кіеў, прыбылі ў Рагачоў. Пройдзены 191 кіламетр. Настрой каманды добры. Дождж не перашкаджае нашаму руху ўперад. Спяваем песні. Грае патэфон».

**12 жніўня 1937.** «...Англійская Ліга рэформы каральнай сістэмы апублікавала статыстычныя даныя аб колькасці зняволеных у турмах у радзе краін. Згодна гэтай статыстыкі, першае месца па колькасці зняволеных займае Германія, у якой налічваецца 156,9 зняволеных на кожныя 100 тысяч насельніцтва, не лічачы зняволеных у канцэнтрацыйных лагерах і дамах папярэдняга зняволення. Другое месца займае Польшча, трэцяе — Італія».

***P.S.*** *Дробныя літары на старой пажоўклай газетнай паперы... Зараз, сучаснікамі яны ўспрымаюцца як маўклівыя спадарожнікі той рэчаіснасці, якую сёння толькі і можна ўбачыць сярод экспанатаў музеяў. Праўда, перагарні чарговую старонку ссохлай падшыўкі і адчуеш як гэтыя літары ўцягнуць цябе ў вір надзённых, а часам самых неверагодных праблем. Для тагачасных чытачоў «Звязда» была не толькі скарбонкай карыснай інфармацыі, але надзеяй, як той самалёт Чырвонага крыжа, на ўпэўненае, без перагібаў сістэмы і цяжкасцяў вайны, жыццё. Для нас гэта ўжо гісторыя. Аднак праз гэтыя часам досыць гумарныя, але сур'ёзныя і актуальныя сёння паведамленні пазнаеш краіну, успамінаеш уласных продкаў і спрабуеш удасканаліць самога сябе.*

**Падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ.**

# Краіна здароўя

Выпуск № 27 (141)


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## СОНЕЧНА І ЦЁПЛА

У гэтыя выхадныя тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў скандынаўскага антыцыклона, таму ападкаў не будзе, толькі ўдзень на паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці магчымыя кароткачасовыя дажджы і навальніцы, паведаміў рэдакцыі **начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ**.

Уначы і раніцай месцамі па краіне ў выхадныя будзе назірацца туман. Тэмпература паветра ўначы 7—13, у нядзелю па паўночным усходзе ў асобных раёнах толькі 5—6 цяпла, удзень 17—24 градусы.

На пачатку наступнага тыдня захавецца сонечнае надвор'е. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ў першай палове наступнага тыдня ўначы 7—14, месцамі ў нізінах 5—6 градусаў, удзень 20—25 цяпла. Сапраўды камфортнае летняе надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Лекі для пахудзення — толькі па рэцэпце!

**У Міністэрстве аховы здароўя занепакоены выпадкамі парушэння работнікамі аптэк вызначанага парадку безрэцэптурнага водпуску лекаў, якія пачасціліся апошнім часам, а таксама скаргамі грамадзян на наступствы бескантрольнага прымянення некаторых лекавых сродкаў.**

Трэба патлумачыць, што Пералік лекавых сродкаў, якія рэалізуюцца ў аптэчных установах без рэцэпта ўрача, пастаянна пераглядаецца, паколькі ў нашай краіне рэгіструюцца новыя лекі айчыннай і замежнай вытворчасці або новыя формы выпуску раней зарэгістраваных. На некаторыя прэпараты тэрмін дзеяння рэгістрацыйных пасведчанняў завяршаецца. Да таго ж пастаянна вядуцца работы па вывучэнні эфектыўнасці і бяспечнасці лекавых сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў практычнай медыцыне. Апошні раз пералік пераглядаўся ў лістападзе мінулага года. Пры распрацоўцы новага дакумента, у прыватнасці, улічвалася практыка і аналіз прымянення безрэцэптурных лекавых сродкаў з ранейшага пераліку, выкарыстоўваліся апошнія звесткі аб іх бяспечнасці, пераноснасці, эфектыўнасці, тэрапеўтычнай распаўсюджанасці, прымаліся пад увагу таксама дазіроўка дзеючага рэчыва і форма выпуску. Цяпер пералік уключае 198 міжнародных непатэнтаваных найменняў лекавых сродкаў і 682 гандлёвыя назвы камбінаваных лекавых сродкаў — усяго 880 пазіцый. Што датычыцца прэпаратаў, не уключаных у гэты пералік, то яны павінны рэалізоўвацца толькі па прызначэнні ўрача. Аптэкі не павінны заахвочваць самалячэнне пацыентаў.

Між тым, праведзеныя ў першым паўгоддзі праверкі паказалі, што, на жаль, маюць месца выпадкі водпуску з аптэк без прызначэння ўрача такіх рэцэптурных лекавых сродкаў, як антыбіётыкі для сістэмнага прымянення, мачагонных сродкаў, сродкаў для лячэння захворванняў стрававальнага тракта і парушэнняў абмену рэчываў, у тым ліку выпадкі іх водпуску дзецям да 15 гадоў. Акрамя таго, у арганізацыях недзяржаўнай формы ўласнасці, якія ажыццяўляюць медыцынскую дзейнасць, не заўсёды маюцца ў распараджэнні ўрачоў адпаведныя рэцэптурныя бланкі. Нярэдка ўрачы не выпісваюць пацыенту рэцэпт, а даюць рэкамендацыі ў вуснай форме або занатоўваюць свае прызначэнні на шматках паперы адвольнай формы без указання дазіроўкі, формы выпуску і схемы прымянення.

Міністэрствам аховы здароўя ўжо неаднаразова звярталася ўвага на недапушчальнасць такіх парушэнняў, а таксама на небяспеку самалячэння і бескантрольнага прымянення, напрыклад, антыбіётыкаў, якое цягне ўзнікненне ўстойлівых да антыбактэрыяльных прэпаратаў мікраарганізмаў. І, як вынік, назіраецца значнае зніжэнне эфектыўнасці антыбіётыкаў пры лячэнні цяжкіх інфекцыйных захворванняў.

У апошні час выяўлены факты злоўжывання лекавым сродкам пад міжнароднай непатэнтаванай назвай «сібутрамін», які зарэгістраваны ў Беларусі пад гандлёвымі назвамі «Сібутрамін» (капсулы па 10 мг, Румынія), «Мерыдыя» (капсулы па 10 і 15 мг, Германія) і «Ліндакса» (капсулы па 10 і 15 мг, Чэшская Рэспубліка). Згодна з інструкцыяй, паказаннямі да іх прымянення з'яўляецца стан, звязаны з аліментарным атлусценнем, у тым ліку і ў спалучэнні з цукровым дыябетам. Прэпарат, які скіраваны на зніжэнне патрэбы ў ежы, павінен прызначацца ўрачамі, якія маюць вопыт карэкцыі атлусцення ў рамках комплекснай тэрапіі, пры гэтым дозу для кожнага пацыента ўрач вызначае індывідуальна, а адпускацца з аптэк яны могуць толькі па рэцэпце. Такія меры перасцярогі зусім невыпадковыя: адна з прычын — фармакалагічныя ўласцівасці сібутраміну і шматлікія пабочныя эфекты ад яго ўжывання, другая — сур'ёзныя супрацьпаказанні да яго прызначэння. Да іх адносяцца сардэчна-сасудзістыя захворванні, артэрыяльная гіпертэнзія, парушэнні функцыі печані і нырак, неўралагічныя захворванні, глаўкома, цяжарнасць, грудное выкормліванне, парушэнні функцыі шчытападобнай залозы і нават узрост да 18 гадоў. Сярод асаблівых указанняў па прыёме сібутраміну — пастаянны кантроль за артэрыяльным ціскам і частатой сардэчных скарачэнняў, выключэнне адначасовага прызначэння многіх лекавых сродкаў, прымяненне яго толькі ў тых выпадках, калі ўсе немедыкаментозныя мерапрыемствы па зніжэнні масы цела аказаліся малаэфектыўныя.

На практыцы, канстатуюць медыкі, мелі месца выпадкі, калі бескантрольнае прымяненне сібутраміну з мэтай зніжэння вагі ў асобаў маладога ўзросту станавілася прычынай развіцця ў іх аліментарнай дыстрафіі, кахексіі і неўрозаў. Бескантрольны водпуск і ўжыванне сібутраміну, папярэджваюць у галоўным медыцынскім ведамстве краіны, небяспечныя! Уладальнікі ліцэнзій на фармацэўтычную дзейнасць, якія парушаюць правілы рэалізацыі, рызыкуюць пазбавіцца сваёй ліцэнзіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# Восы і пчолы «паважаюць» салодкае...

**Медыкі папярэджваюць: у апошні месяц лета традыцыйна пачашчаюцца ўкусы людзей восамі, пчоламі і шэршнямі.**

— У большасці выпадкаў насякомыя на чалавека не нападаюць, але могуць агрэсіўна адрэагаваць на бурную жэстыкуляцыю і спробу разбурыць іх «жыллё», — расказала журналісту «Звязды» **в.а. загадчыка аддзялення інфармацыйнага забеспячэння насельніцтва Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандра ЛАГУН**.— Даволі часта прыцягнутыя пахам садавіны, ягад, сокаў і салодкіх напояў пчолы ці восы залятаюць у жыллё і садзяцца на прадукты. А пры спробах прагнаць няпрошанага госця насякомае, як правіла, джаліць. Больш сур'ёзныя наступствы бываюць, калі чалавек не заўважае насякомага і можа яго праглынуць з напіткам ці кавалачкам ежы. У гэтых выпадках магчымы ўкус у вусны, слізістыя абалонкі поласці рота і глоткі ці ў язык.

У момант укусу джала насякомага выдзяляе 0,2—0,3 мг яду, які выклікае востры пякучы боль, што суправаджаецца пачырваненнем, ацёкам і свербам. Ступень атручэння ядам залежыць ад колькасці ўкусаў, месца паражэння і індывідуальнай адчувальнасці чалавека. У пацярпелых могуць назірацца дрыжыкі, сухасць у роце, галавакружэнне, млоснасць. Больш цяжкія паражэнні звязаныя не з уздзеяннем яду на арганізм, а з павышанай адчувальнасцю да яго. У алергікаў укус асы ці пчалы выклікае моцны галаўны боль, млоснасць, ваніты, нясцерпны сверб, астматычныя прыступы, рэзкае падзенне артэрыяльнага ціску. Калі насякомае ўкусіла ў твар, шыю, слізістыя абалонкі поласці рота, магчыма ўтварэнне абшырнага ацёку дыхальных шляхоў і вострае ўдушша, якое вымагае тэрміновага правядзення рэанімацыйных мераў.

Калі вас укусіла пчала, выдаліце джала, якое засталося ў ранцы (пры ўкусе восаў джала не застаецца) і прыкладзіце да месца ўкусу ватку, сурвэтку ці насоўку, змочаныя ў адэкалоне, гарэлцы ці спірце. Можна выкарыстаць таксама раствор перакісу вадароду, пітной соды (0,5 чайнай лыжкі на шклянку вады) ці разбаўленага ў суадносінах 1:1 нашатырнага спірту з вадой. Для зняцця свербу можна выкарыстоўваць слабыя гарманальныя мазі і крэмы (гідракартызон, сінафлан, алергадыл, элакон). Мясцовыя (скурныя) алергічныя рэакцыі ліквідуюцца прыёмам антыгістамінных прэпаратаў: супрасціну, піпальфену, тавегілу, фенкаролу. У выпадку цяжкай алергічнай рэакцыі, калі ва ўкушанага развіваецца ацёк Квінке, ацёк гартані ці астматычны прыступ, пацярпелага неабходна тэрмінова даставіць у медыцынскую ўстанову для аказання неадкладнай дапамогі.

І напрыканцы яшчэ адна карысная парада: перад тым, як зрабіць глыток, зазірніце ў кубак і пераканайцеся, што там не хаваецца насякомае...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЯЗВУ СОДАЙ НЕ ЗАЛЕЧЫШ

**Язва страўніка і язва дванаццаціперснай кішкі — пры ўсіх адрозненнях гэтыя хваробы смела можна назваць сёстрамі-блізнятамі.**

Дзве язвы ў многім падобныя адна на адну. Іх аб'ядноўваюць:

● малады ўзрост: 75 % хворых да 40 гадоў;

● мужчыны хварэюць удвая часцей, чым жанчыны;

● восеньскія і веснавыя абвастрэнні;

● боль узнікае, як правіла, пад дыхавіцай, часта аддаючы ў левую палову грудной клеткі і левую лапатку, грудны або паяснічны аддзел пазваночніка. Але ў 15 % выпадкаў язва можа зусім не балець і працякаць скрыта, а моцны боль з'яўляецца толькі ў перыяд абвастрэння, пры прабадзенні (разрыве сценак страўніка) або крывацёку. І для хворага, і для ўрачоў — гэта самыя складаныя выпадкі;

● нярэдка язву суправаджаюць кіслая адрыжка, пякотка;

● як правіла, язвеннікі — людзі вельмі ўзбуджальныя, патрабавальныя, недаверлівыя.

Тым не менш адну язву з другой не пераблытаць. Вось іх асноўныя адрозненні:

| Язва страўніка | Язва дванаццаціперснай кішкі |
|---|---|
| Боль праз 30—60 хвілін пасля яды | Боль нашча або праз 2—3 гадзіны пасля яды |
| Ежа не дапамагае | Ад ежы становіцца лепш |
| Ваніты характэрныя | Ваніты бываюць рэдка |
| Апетыт сярэдні або дрэнны, вага звычайна ніжэй за норму | Апетыт добры, часам паўната |

Дзесяцігоддзямі лічылася: язва — гэта наступства стрэсаў, памножаных на хібы ў харчаванні і спадчыннасць плюс курэнне і алкаголь. Новы погляд на прычыны язвавай хваробы прыйшоў з адкрыццём бактэрыі хелікабактар пілары. Мікроб цудоўна сябе адчувае ў месцы, дзе іншыя сабраты не выжывалі, — унутры страўніка, у растворы салянай кіслаты. (Вядома ж, «голая» бактэрыя гэтаксама безабаронная перад салянай кіслатой, як і іншыя. Але хелікабактар хітры — ён хаваецца ад ператраўлівання, схаваўшыся пад слізззю, як у скафандры, і трывала прымацаваўшыся да клетак абалонкі страўніка або дванаццаціперснай кішкі. Так ён чакае, пакуль стрэс, няправільнае харчаванне або іншы шкодны фактар не пашкодзяць слізістую абалонку. Тады хелікабактар пачне сваю разбуральную работу.) У дадатак яго выявілі ў людзей, якія хварэлі на гастрыт і рак страўніка. З тых часоў кіслоталюбівая бактэрыя лічыцца адной з асноўных прычын гэтых захворванняў страўнікава-кішачнага тракта.

Фактары, якія павялічваюць рызыку ўзнікнення язвавай хваробы: павышаная кіслотнасць страўнікавага соку, які нібы абпальвае слізістую; недастаткова шчыльнае закрыццё натуральнай заслонкі паміж страўнікам і дванаццаціперснай кішкай — у выніку ў апошнюю трапляе вельмі шмат салянай кіслаты або, наадварот, у страўнік закідваецца шчолачнае змесціва; парушэнне выпрацоўкі слізі, якая ахоўвае сценкі страўніка ад раз'ядаючага дзеяння салянай кіслаты; хібы ў рытме харчавання — нерэгулярная яда, перавага фаст-фуду, марынадаў і вострых страў; стрэсы; курэнне і алкаголь — яны выклікаюць парушэнне мікрацыркуляцыі крыві ў сценках страўніка і дванаццаціперснай кішкі; спадчыннасць.

І яшчэ. Бескантрольны прыём некаторых лекаў таксама можа стаць прычынай язвы. У небяспечны спіс уваходзяць:

● аспірын (асабліва шкодна піць яго да яды);

● нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты;

● антыкаагулянты, якія паніжаюць згусальнасць крыві;

● картыкастэроіды — гарманальныя сродкі.

Дактары сцвярджаюць: толькі што выяўленую язву важна як мага хутчэй пачаць лячыць, прычым біць трэба па ўсіх франтах. У гэтым выпадку пасля 6—8 тыдняў медыкаментознай тэрапіі звычайна ўдаецца дабіцца ўстойлівага эфекту. Лячэнне ідзе па трох кірунках: антыбактэрыяльныя прэпараты, якія «забіваюць» хелікабактар; сродкі для змяншэння выпрацоўкі салянай кіслаты; абвалакальныя прэпараты.

Але ў сур'ёзных выпадках гэтых мераў мала. Пры крывацёку ў хворага нарастае слабасць (аж да страты прытомнасці), з'яўляюцца халодны ліпкі пот, ваніты, пачашчанае сэрцабіццё. Для прабадзення язвы характэрны моцны («кінжальны») боль у жываце, змесціва стрававальнага органа разліваецца па брушной поласці, пачынаецца запаленне. У такім цяжкім стане чалавек трапляе прама на аперацыйны стол.

Памятайце! Самалячэнне — адна з самых вялікіх памылак, якую робяць людзі пры з'яўленні непрыемных адчуванняў у вобласці жывата. Сапраўды, нярэдка прыём соды або якога-небудзь антацыднага прэпарата здымае боль і прыносіць часовую палёгку. Аднак пры гэтым не дасягаецца поўнага вылечвання, і наступныя рэцыдывы могуць быць куды больш сур'ёзнымі. Таму нават пры нязначным падазрэнні на язву трэба абавязкова пракансультавацца з урачом-гастраэнтэролагам.

Вялікая роля ў лячэнні язвавай хваробы і прафілактыцы яе абвастрэнняў належыць дыетычнаму харчаванню. Язвеннікам неабходна перагледзець свае гастранамічныя звычкі. Перш за ўсё, ім трэба як мага часцей харчавацца — 4—5 разоў на дзень, невялікімі порцыямі. Аддаваць перавагу адвараным мясу і рыбе, яйкам усмятку, малаку, тварагу (лепш, калі ён будзе прыгатаваны ў хатніх умовах). Агародніну лепш есці вараную, тушаную, у выглядзе пюрэ, паравога суфле, запяканкі. Уключаць у рацыён кашы, кісялі, жэле, печаныя яблыкі, мінеральную шчолачную ваду без газу (тыпу «Баржомі»). Дазваляюцца макарона, чэрствы белы хлеб. Тэмпература прыгатаванай ежы павінна быць блізкай да тэмпературы цела.

Дабратворна ўздзейнічаюць на слізістую страўніка: сок свежай капусты, маркоўны і бульбяны сок, мёд, сок алоэ, абляпіхавы алей, адвар або сок трыпутніку.

А вось прадукты, якія раздражняюць слізістую страўніка і ўзбуджаюць сакрэцыю салянай кіслаты, варта выключыць: навcareстыя мясныя, рыбныя і грыбныя булёны, вяндліну і смажаныя стравы, саленні і марынады, агародніну ў сырым выглядзе, вострыя прыправы, цыбулю, часнок, цытрусавыя, чорны хлеб, выпечку, марожанае, газаваныя фруктовыя напоі, каву, моцны чай.

Зрэшты, заўсёды трымаць сябе ў чорным целе язвенніку зусім неабавязкова. У перыяд рэмісіі хваробы не выключаецца і святочны стол. Спецыялісты называюць такія адступленні ад правілаў — вядома ж, у разумных межах! — зігзагамі. Урэшце рэшт, язвеннік — таксама чалавек.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Інфарм-укол

# «Твар» тлушчаў

**Наша ежа ўтрымлівае розныя тыпы тлушчаў.**

### Насычаныя тлушчы

Большая частка такіх тлушчаў паступае з ежы жывёльнага паходжання — мяса, малака і малочных прадуктаў. Да раслінных крыніц насычаных тлушчаў адносяць трапічны алей — какосавы, пальмавы і алей какавы. У адрозненне ад іншых відаў алею трапічны складаецца пераважна з насычаных тлустых кіслот. Яны з'яўляюцца абавязковымі інгрэдыентамі гатовых пірожных, тортаў, іншых прысмакаў і закусак хуткага харчавання. Насычаныя кіслоты прыводзяць да павышэння ўзроўню «дрэннага» халестэрыну.

### Мананенасычаныя тлушчы

Аліўкавы, арахісавы і канапляны алей у адрозненне ад насычаных у рэкамендаваных канцэнтрацыях дапамагае знізіць утрыманне ў крыві агульнага халестэрыну і павышае супраціўляльнасць да акіслення, працэсу, які палягчае працэс паглынання халестэрыну і тлушчаў клеткамі сценак сасудаў.

### Поліненасычаныя тлушчы

Таксама як і мананенасычаныя знаходзяцца ў многіх відах алею і дапамагаюць знізіць у крыві ўзровень ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці. У адрозненне ад мананенасычаных поліненесычаныя ўразлівыя для перакіснага акіслення.

### Гідрагенізаваныя тлушчы

Транстлустыя кіслоты ўтвараюцца ў працэсе гідрагенізацыі поліненасычаных тлустых кіслот. Адным з прыкладаў гідрагенізаванага тлушчу з'яўляецца маргарын. Калі яго гідрагенізуюць, некаторыя поліненасычаныя кіслоты ператвараюцца ў насычаныя. Гэты працэс робіць тлушч больш цвёрдым. Чым большы працэс гідрагенізацыі, тым больш насычаным становіцца тлушч.

Вынікі даследаванняў паказваюць на тое, што гідрагенізаваныя тлушчы павышаюць узровень агульнага халестэрыну, ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці і зніжаюць узровень у крыві халестэрыну ліпапратэінаў высокай шчыльнасці («добрага» халестэрыну). З дапамогай гідрагенізаваных тлушчаў вырабляецца незлічоная колькасць прадуктаў — пячэння, вафляў, крэкераў, дэсертаў і г.д.

# Жаданне падводзіць?

**Вучоныя з медыцынскага каледжа Бостанскага ўніверсітэта мяркуюць, што гарманальныя сродкі зніжаюць сэксуальную цягу. Яны выявілі, што ў жанчын, якія рэгулярна прымаюць супрацьзачаткавыя таблеткі, нізкі ўзровень тэстастэрону — гармону, які адказвае за сэксуальнасць.**

Італьянскія вучоныя таксама абрынуліся з крытыкай на гарманальныя сродкі, праўда, абапіраліся пры гэтым на іншыя аргументы. Яны прапанавалі ўдзельніцам эксперыменту ацаніць водар анісу, гваздзікі, аміяку і іншыя. Тыя, хто не прымаў кантрацэптывы, распазнавалі ўсе пахі, асабліва тыя дамы, у каго ў гэты момант была авуляцыя — у сярэдзіне цыкла ўспрымальнасць да пахаў і сэксуальная цяга дасягаюць свайго піку. А жанчыны, якія прымалі гармоны, засталіся раўнадушнымі да прапанаваных пахаў. Такія «паломкі» органаў нюху могуць знізіць лібіда, паколькі менавіта нос улоўлівае эратычныя токі партнёра.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

Здароўе на талерцы

# Выбіраем прадукты па колеры

Стаміліся, не хапае сілаў і натхнення? Вучоныя запэўніваюць: ваш рацыён варта папоўніць **прадуктамі чырвонага колеру**, такімі, як памідоры, перац, кавун, вішня, маліна, чырвоныя парэчкі. Яны насычаюць арганізм энергіяй, робяць нас свабоднымі і імклівымі, лёгкімі на пад'ём. Яны ж надаюць упэўненасці ў сваіх сілах і натхняюць на дасягненне пастаўленых мэтаў. Чырвоны колер традыцыйна выбіраюць энергічныя, мэтанакіраваныя людзі.

А вось добры настрой залежыць ад **прадуктаў жоўтага колеру**, такіх, як рэпа, кукуруза, бананы, лімоны, жоўтыя слівы, алыча і нават проса. Некаторыя даследчыкі лічаць, што жоўтым колерам можна лячыць нервовыя захворванні. Чым бліжэй да аранжавага, тым больш яркі настрой.

**Аранжавы** (апельсіны, абляпіха, морква, дыня, абрыкосы) — колер аптымістаў, ён саграваe, пазбаўляе ад негатыўных эмоцый; звязаны з сэксуальнасцю і палавой сферай; умацоўвае імунітэт, паляпшае кровазварот і страваванне, робіць нас добразычлівымі і гаваркімі.

**Зялёны** — гэта гармонія, спакой, прымірэнне. Чым больш мы ўжываем агуркоў, зялёных яблыкаў, усялякіх ядомых травак, тым лягчэй прымаем свет такім, які ён ёсць, жывём у міры і згодзе з навакольнымі людзьмі. З зялёным колерам лягчэй дыхаецца, сыходзяць стрэсы, перанапружанне, галаўныя болі. Верагодна, эмацыянальна зялёны звязаны з вясной, абнаўленнем...

**Карычневы колер** (гарбата, кава, грэчка і г.д.) — устойлівасць, яснасць і ў той жа час асцярожнасць. Мы сумленнымі вачыма глядзім на свет і хочам такой жа сумленнасці ад навакольных. Гэты колер уплывае на разумовыя і фізічныя здольнасці. Напрыклад, вучоныя сцвярджаюць: калі мы п'ём какаву, дык адчуваем сябе абароненымі і разумнымі.

А вось **фіялетавы** — колер духоўнага развіцця, палёту думкі і глыбіні пачуццяў, колер філосафаў і містыкаў. Таму прадукты фіялетавага колеру, такія, як баклажаны, слівы, вінаград, чорныя парэчкі, чарніцы, ажына, развіваюць інтуіцыю, уяўленне, паляпшаюць мысліцельную дзейнасць. Адным словам, хочаце паглыбляць духоўныя веды і ствараць — ешце фіялетавую гародніну і садавіну. Тым больш, што жнівень, надзвычай багаты на дары прыроды, дае нам магчымасць фантазіраваць і эксперыментаваць.

**ПРОСТА ЗЯЛЁНАЯ САЛАТА**

Вам спатрэбіцца: *400 г капусты белакачаннай, 100 г салаты зялёнай, па 50 г зяленіва пятрушкі і кропу, 50 г зяленіва сельдэрэю, смятана, соль на смак.*

Спосаб прыгатавання: капусту нашаткаваць, памяць, пакінуць да з'яўлення соку. Усё зяленіва дробна нарэзаць, перамяшаць, пасаліць, заправіць смятанай.

**ВОСТРЫ «АРАНЖ»**

Вам спатрэбіцца: *4 морквіны, 4 зубкі часнаку, 1—2 см кораня хрэну, 2 памідоры, па 50 г зяленіва пятрушкі і кропу, маянэз, соль на смак.*

Спосаб прыгатавання: моркву надзерці на буйной тарцы, часнок і хрэн — на дробнай, пятрушку пасячы, памідоры парэзаць малымі скрылікамі. Усё перамяшаць, пасаліць, заправіць маянэзам, зверху ўпрыгожыць кропам.

**ЗАКУСКА «ЧЫРВОНАЕ З БЕЛЫМ»**

Вам спатрэбіцца: *300 г памідораў, 150 г тварагу, 4 ст. лыжкі вяршкоў, 1 салодкі перац, 50 г зялёнай цыбулі, па 50 г зяленіва кропу і пятрушкі, соль, перац на смак.*

*Спосаб прыгатавання:* памідоры прамыць, нажом выразаць асяродкі, напоўніць сумессю тварагу з вяршкамі і мякаццю (сумесь папярэдне пасаліць і паперчыць). Выкласці на вялікую талерку. Зверху пасыпаць дробна пасечаным зяленівам і ўпрыгожыць кольцамі салодкага перцу.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## ГІНУЦЬ ЛЮДЗІ Ў ВАДЗЕ

Толькі за ліпень у вадаёмах Брэстчыны загінула 34 чалавекі, з іх шасцёра дзяцей. На вадасховішчы Пагост-Загародскае Пінскага раёна загінулі пляменнік і дзядзька. Адразу пачаў тануць дарослы, а хлапчук спрабаваў яго ратаваць. Не выжыў ніводзін. Найчасцей, паводле статыстыкі таварыства ратавання на водах, гінуць людзі на падпітку. У Кобрыне 40-гадовы нецвярозы мужчына ўтапіўся ў невялікай сажалцы. А каля Пінска патануў сталы рыбак, які перад гэтым таксама выпіў. На працягу ліпеня ў рэгіёне загінула пяцёра рыбакоў-аматараў.

**Яна СВЕТАВА.**

# ЯК НЕ ТРАПІЦЬ У СІЛО БЯССОННІЦЫ

**Амаль трэць жыцця чалавек праводзіць у сне. Сон неабходны людзям, каб аднавіць сілы і адпачыць ад працы і турбот. Аднак не ўсе могуць пахваліцца моцным здаровым сном...**

Бяссонніца праяўляецца па-рознаму, таму што і прычыны яе ўзнікнення вельмі разнастайныя. Адны людзі не могуць заснуць з-за неадступных навязлівых думак, якія бударажаць іх усю ноч і трымаюць у напружанні ўвесь дзень. Іншыя пакутуюць ад хранічнага болю, які перашкаджае паўнацэннаму сну. Нярэдка і кубачак моцнай кавы на ноч, курэнне або алкаголь «крадуць» сон. Хворых на дэпрэсію бяссонніца адольвае з 4—5 гадзін раніцы, прыносячы стан прыгнечанасці і няўцешнай нуды яшчэ да першых сонечных прамянёў. Непаўнацэнны сон знаёмы і тым, хто любіць спаць толькі ў сваім доме, а на новым месцы — «вачэй не зводзіць». Але часам бывае і так, што менавіта ўласная спальня становіцца тым умоўна-рэфлекторным фактарам, які гоніць сон прэч. Гэта адбываецца ў тым выпадку, калі «спальнае» месца асацыюецца з сямейнымі канфліктамі: спрэчкамі, адчуваннем віны, трывогі або непажаданай інтымнай блізкасцю. Вельмі часта людзі расказваюць, што яны страцілі сон пасля смерці блізкага чалавека, разлукі або з-за кахання без узаемнасці. Змена гадзінных паясоў і праца ў начную змену таксама адбіваюцца на якасці сну. Напружаны графік работы, стрэсы, стомленасць, перажыванні і боязь пагаршэння ўзроўню жыцця і фінансавага дабрабыту таксама могуць стаць прычынай бяссонніцы.

І ўсё ж часцей за ўсё ўзнікненне бяссонніцы звязана з парушэннем элементарных правілаў гігіены сну.

● **Скарачіце час знаходжання ў ложку перад сном.**

Чым даўжэй вы ляжыце ў пасцелі, тым больш перарывістым будзе сон. Медыкі сцвярджаюць, што ў ложку трэба ляжаць столькі часу, колькі, на вашу думку, непасрэдна патрабуецца для сну плюс яшчэ 15—20 хвілін.

Не спрабуйце заснуць, калі не хочаце спаць. Акрамя таго, не спіце ўдзень, нават калі вельмі хочацца. Не лажыцеся вельмі рана. Калі непакоіць боль, лепш прыняць болесуцішальны сродак, чым мучыцца, пакутуючы не толькі ад болю, але і ад бяссонніцы.

Прывучыце сябе лажыцца спаць у адзін і той жа час. Але калі на працягу паўгадзіны заснуць не ўдаецца, то пачытайце, паглядзіце тэлевізар, паслухайце лёгкую музыку або займіцеся чым-небудзь іншым. Некаторым людзям дастаткова ненадоўга выйсці са спальні і зноў вярнуцца, каб потым хутка заснуць.

● **Уставайце ў адзін і той жа час штодзень, нават у выхадныя.**

Работа арганізма рэгулюецца сутачнымі рытмамі, а таму патрэбная пастаянная кропка для пачатку адліку біялагічнага гадзінніка. Фіксуючыся на ёй, арганізм кантралюе час унутраных працэсаў. Нагадаем, што адзіны падуладны нам час — гэта той, калі мы прачынаемся і расплюшчваем вочы, каб прамяні святла «завялі» біялагічны гадзіннік.

● **Прыміце гадзіннік, каб не глядзець на яго ноччу.**

Павярніце яго цыферблатам у іншы бок. Калі вы і прачняцеся пасярод ночы, то не будзе спакусы на яго глядзець, падымаць галаву і ўзірацца ў лічбы, ды яшчэ адзяваць для гэтага акуляры, часам не адразу знайшоўшы іх. Не расплюшчвайце вочы зусім, тады будзе лягчэй заснуць. Ды і якая розніца, колькі гадзін, калі вы ўсё адно не спіце?

● **Вячэра павінна быць лёгкай.**

На галодны страўнік, таксама як і на перапоўнены, заснуць цяжка. Даследаванні паказалі, што сон паляпшае амінакіслата трыптафан, якая ўтрымліваецца ў малочных прадуктах. Таму шклянка цёплага малака на ноч дапаможа вам заснуць. Трыптафан прысутнічае таксама ў бананах, сыры, індзейцы. Чым не вытанчаная вячэра?

● **Не ўжывайце кафеін, алкаголь і тытунь перад сном.**

Дзеянне кафеіну доўжыцца 3—5 гадзін. Памятайце, што ён ёсць не толькі ў каве, але і ў гарбаце, шакаладзе, газаваных напоях і зусім не ў бяскрыўдных дозах. Напрыклад, у кока-коле — 46 мг кафеіну, у дыетычнай пепсі — 35 мг, а ў 50 г малочнага шакаладу — 9 мг. Таму пасля 16 гадзін дня лепш не ўжываць напоі з кафеінам.

Нікацін узбуджае і тым самым ускладняе сон. Бяссонніца — важкая прычына, каб кінуць курыць.

Алкаголь прыводзіць да абязводжвання арганізма, з-за чаго начны сон бывае павярхневым з частым перарываннем. Як вынік — слабасць, галаўны боль. Гэтыя наступствы ўзмацняюцца яшчэ і прадуктамі распаду алкаголю, якія выводзяцца з арганізма на працягу некалькіх сутак.

● **Рабіце фізічную зарадку раніцай.**

Фізічная актыўнасць перад сном пераўзбуджае нервовую сістэму арганізма, які рыхтуецца да вячэрняга спакою. Таму старайцеся заканчваць заняткі спортам у больш ранні час, ва ўсякім разе, гадзін за шэсць да сну. Перад сном жа карыснымі будуць спакойныя прагулкі на свежым паветры. Да таго ж, кісларод з'яўляецца выдатным антыдэпрэсантам, павышае настрой, здымае напружанне.

● **Зрабіце для сну спрыяльныя ўмовы.**

Немалаважнае значэнне мае каляровае і светлавое рашэнне памяшкання: яркія, агрэсіўныя колеры, моцнае асвятленне мала садзейнічаюць расслабленню. Лепш, калі спальня аформленая ў спакойных, нейтральных або пасцельных адценнях, а святло будзе прыглушаным, уключаным на няпоўную магутнасць.

Вазьміце за правіла праветрываць спальню перад сном. Напрыклад, пакуль вы гуляеце з чатырохногім сябрам або проста стаіце на балконе.

● **Навучыцеся тэхніцы расслаблення і прымяняйце яе.**

Пры бяссонніцы праблема заключаецца ў тым, што чым больш чалавек спрабуе заснуць, тым менш у яго на гэта шанцаў. Можа развіцца неўроз чакання: мы не спім таму, што баімся не заснуць. У гэтым выпадку дапамогуць рэлаксуючыя практыкаванні:

1) Запавольце дыханне і ўявіце, што паветра марудна ўваходзіць і выходзіць з вас. Дыхайце з дапамогай дыяфрагмы, надзімаючы жывот.

2) Праганяйце трывожныя думкі. Добра ўявіць сабе прыемны пейзаж: цёплы летні вечар, марскі брыз, шолах бярозак у лесе, пачуць стракат конікаў, павеў ветрыку.

● Памятайце: **снатворнае (як і любыя іншыя лекі) прымаюць толькі хворыя людзі.** Вы — не хворы, таму не прымайце гэта лякарства проста так. Снатворнае — гэта крайняя мера, і прызначыць яго можа толькі ўрач.

● **Спальня — не месца для трывожных думак, спрэчак і канфліктаў.**

Пры напружаным графіку працы магчымасць падумаць аб пройдзеным дні з'яўляецца перад сном. Ведайце, што гэта няўдалы момант, каб успомніць пра праблемы. Не нясіце іх у спальню. Пакой, дзе чалавек адпачывае, павінен асацыявацца толькі са станоўчымі эмоцыямі. Паспрабуйце на ноч расслабіцца. Гэтаму пасадзейнічаюць цёплая, але не гарачая ванна, лёгкі масаж, цікавая, але не ўзбуджальная кніга.

● **Спаць лепш за ўсё на баку, у позе эмбрыёна. Такое становішча цела падсвядома заспакойвае чалавека, расслабляе.**

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ АД БЯССОННІЦЫ**

● 1 ч. лыжку кветак маку заліваюць 1 шк. гарачага малака і награваюць на вадзяной лазні 10—15 хвілін. Гатовы адвар ахалоджваюць, працэджваюць, дадаюць гатаванае малако да аб'ёму 200 мл. Прымаюць па 1 ст. лыжцы за 20—30 хвілін да сну.

● 1 ст. лыжку здробненай травы мелісы лекавай заліваюць шклянкай гарэлкі і настойваюць 8—10 дзён у цёплым цёмным месцы. Гатовую настойку працэджваюць. Прымяняюць па 15 кропель 3 разы на дзень.

● Змешваюць 1 ст. лыжку кветак лаванды і 1 ч. лыжку кветак пасіфлоры. Сумесь заліваюць 2 шк. гатаванай вады і настойваюць 15—20 хвілін. Гатовы настой працэджваюць. Прымаюць па 0,4 шклянкі 2—3 разы на дзень.

# Серыя другая.
# ПОШУКІ ДОМА

***Скарочаны пераказ папярэдняй серыі (17.06.2009 г.).*** **Трое халастых хлопцаў ва ўзросце ад 23 да 29 гадоў вырашылі заняцца аграэкатурызмам. Са сваёй ідэяй яны выйшлі на журналістку газеты «Звязда», якая піша на гэту тэму. Журналістка, узамен на свае кантакты ў сферы аграэкатурызму, прапанавала хлопцам дазволіць ёй асвятляць у газеце ўсе іх крокі на шляху да мэты. Аляксей, Канстанцін і Павел пагадзіліся. У хуткасці яны сустрэліся з Андрэем Ніжнікам, гаспадаром сядзібы «Зарачаны», што на Пухаўшчыне. Той выслухаў іх даволі скептычна, маўляў, спазніліся, раней трэба было пачынаць. Аднак праз некалькі дзён на фестывалі вясковых сядзібаў «Заборскі фэст» у Расонскім раёне Павел і Косця пачулі меркаванне зусім іншае. Некалькі беларускіх аграсядзібаў яны пабачылі на свае вочы і, па іх словах, умацаваліся ў намерах. Аднак як надоўга хопіць іх запалу, не ведае пакуль ніхто. Таму і колькасць газетных «серый» застаецца невядомай. Ва ўсякім разе сёння ўвазе шаноўнага чытача прапануецца другая.**

## ПРАПАНОВА АД ЧЫТАЧКІ

Ужо праз некалькі дзён пасля выхаду першага артыкула ў рэдакцыі раздаўся званок. Званіла падпісчыца «Звязды» Лідзія Уладзіміраўна з Мядзельскага раёна.

— Хачу прапанаваць хлопцам сваю кватэру задарма, — заявіла яна. — Гэта палова фінскага дамка на ўскраіне вёскі Яцкавічы паблізу ад знакамітага Будслава. Я жыву ў суседняй вёсцы Ілава, трымаю карову, магла б хлопцам і дапамагаць, малако турыстам прыносіць.

— Хай бы паспрабавалі, — працягвала жанчына. — Тым больш што грошай у іх, як я зразумела з вашага артыкула, на набыццё дома пакуль няма. Вось яны збяруць гэтыя грошы і нешта купяць, а ў іх, раптам, не атрымаецца? Скарыстаўшыся маёй прапановай, яны ў выпадку няўдачы нічога не згубяць. А калі тут, у Яцкавічах, у іх атрымаецца, яны разам з вопытам набудуць стартавы капітал для набыцця ўласнай сядзібы. Чаму я гэта прапаноўваю? Па-першае, кватэра пустуе. Па-другое, мне і самой цікавы аграэкатурызм, але адна я не рашаюся ім заняцца, а сыны мае жывуць далекавата.

А самае галоўнае, кажа Лідзія Уладзіміраўна, мясціны тут вельмі прыгожыя. Яцкавічы знаходзяцца за 120 кіламетраў ад Мінска, побач Бярэзінскі запаведнік, лес, поўны ягад, грыбоў... Ды і ўчастак у яе вялікі, можна палаткі паставіць.

Прапанова, на мой погляд, была слушнай, асабліва ўлічваючы, што ў хлопцаў сапраўды няма першапачатковага капіталу. Зарабляе з іх пакуль адзін толькі Аляксей, выпускнік Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. Паша знаходзіцца ў вымушаным адпачынку ў сувязі з крызісам і паступленнем у ВНУ, Косця толькі скончыў вучылішча швейнай вытворчасці і ўладкоўваецца на працу. Я расказала ім аб прапанове Лідзіі Уладзіміраўны, і яны паабяцалі абмеркаваць яе і падумаць.



Вёска МАЗАЛІ.

Тым часам на адной з прэс-канферэнцый начальнік упраўлення фізічнай культуры і турызму Мінскага аблвыканкама Алена Брок расказвала журналістам пра ўмовы, якія стварае дзяржава і, у прыватнасці, адміністрацыя вобласці для развіцця агратурызму.

— Сёння наМіншчыне налічваецца 148 вясковых сядзібаў, якія значна адрозніваюцца па спектры паслуг і ўзроўні добраўпарадкавання, — расказала яна. — За два з паловай гады лічба гэта патроілася. Найбольшая колькасць знаходзіцца ў Мінскім, Мядзельскім і Валожынскім раёнах... Аднак сёння маецца шэраг фактараў, якія стрымліваюць развіццё вясковага турызму, галоўным з іх з'яўляецца нездавальняючая інфраструктура і наяўнасць адміністрацыйных бар'ераў...

Алена Брок паведаміла пра намеры ўладаў садзейнічаць стварэнню турыстычных вёсак з традыцыйнай архітэктурай, аграэкатурыстычных комплексаў на базе СВК, рамонту дарог да аграсядзібаў, усталяванню дарожных знакаў і рэкламных шчытоў... Акрамя таго, сказала намеснік начальніка ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскай вобласці, хутка будзе распрацаваны механізм перадачы закінутых гаспадарчых пабудоў (былыя фермы, канюшні, кароўнікі і г.д.), старадаўніх сядзібаў, незанятых зямельных участкаў тым, хто хоча заняцца аграэкатурызмам...

Пасля прэс-канферэнцыі да Алены Брок падышла журналістка «Звязды» і расказала пра задуму адлюстраваць на старонках газеты спробу маладых людзей пачаць агратурыстычную дзейнасць з «нуля».

— Пачынаць ім трэба з райвыканкама, — упэўнена сказала прадстаўніца адміністрацыі вобласці. — Там валодаюць усёй інфармацыяй пра пустыя дамкі. У некаторых выпадках, мне казалі, можна купіць памяшканне пад будучую сядзібу за сімвалічныя грошы, і не трэба першапачатковага капіталу, толькі жаданне і рукі.

Алена Брок назвала тры раёны Мінскай вобласці, дзе агратурызм пакуль яшчэ слаба развіты і дзе начальства само зацікаўлена ў патэнцыйных гаспадарах аграсядзібаў. Яна параіла шукаць дом на Капыльшчыне, Любаншчыне і Крупкаўшчыне.

## ПРЫЁМ У СТАРШЫНІ

Праз некалькі дзён Павел пазваніў старшыні Капыльскага райвыканкама, і той адразу прызначыў сустрэчу. На яе былі запрошаны таксама старшыня Капыльскага сельскага Савета Вольга Купрыенка і галоўны спецыяліст аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Галіна Віяленцій. Галіна Міхайлаўна прыхапіла з сабой спіс з паўсотняй дамоў, якія не маюць гаспадароў. Яшчэ прыкладна на такую ж колькасць дамоў ужо складзены іскавыя заявы ў суд аб прызнанні іх безгаспадарчымі, паведаміла жанчына. Як правіла, райвыканкам прымае рашэнне аб іх зносе. Аднак калі такі дом нехта пажадае выкарыстоўваць пад аграсядзібу, улады гатовыя шукаць магчымасць перадаць яе новаму гаспадару.

У вёсцы, якая мае самы вялікі, з пункту погляду кіраўніка раёна Міхаіла Боды, патэнцыял для развіцця турызму, кінутых дамоў няма. Затое там ёсць магчымасць набыць участак пад забудову.

— Гэта возера Багушы і аднайменная вёска на яго беразе — самыя прыгожыя на Капыльшчыне мясціны, — паведаміў старшыня. — Адзін уладальнік дома ў Багушах ужо зарэгістраваўся як суб'ект аграэкатурызму, плануе пабудаваць лодачную станцыю, кавярню, пабяцаў узяць удзел у добраўпарадкаванні дарогі. Яго сусед таксама хоча паспрабаваць сябе ў гэтым бізнэсе. Думаю, неўзабаве Багушы пераўтворацца ў агратурыстычную вёску.

Вельмі цікавым з пункту погляду развіцця турызму Міхаіл Тарасавіч назваў і Красна-Слабадское вадасховішча на паўднёвым захадзе раёна плошчай у 1600 гектараў. Вадаёмы розных памераў на Капыльшчыне ёсць у кожным населеным пункце. Тут каля трох дзясяткаў рэчак, на поўначы працякае Нёман з прытокамі. А вось з лясамі на радзіме Цішкі Гартнага, Кузьмы Чорнага і, як нядаўна паведаміў Адам Мальдзіс, Казіміра Малевіча, горш — яны займаюць толькі 19 працэнтаў тэрыторыі раёна. Часцей сустракаюцца невялікія, але маляўнічыя гаі. Асноўны кірунак Капыльскага раёна — сельская гаспадарка. Тым, напэўна, і тлумачыцца адставанне па частцы турызму. Людзі тут пакуль маюць занятак, а, значыць і заробак — турызмам ім займацца няма калі. Вось чаму Міхаіл Бода з гатоўнасцю адгукнуўся на зацікаўленасць мінчан у развіцці гэтай сферы на Капыльшчыне. Старшыня лічыць, што магчымасці для гэтага, безумоўна, ёсць.

— Пакажыце ім абавязкова Багушы, потым вёскі Жукі, Яўсеевічы, Папоўцы і Слабодку ў Грозаўскім сельсавеце, — папрасіў сваіх падначаленых старшыня райвыканкама. — На трэцім па прыгажосці месцы, я лічу, вёскі ў Бабаўнянскім сельсавеце: Руднікі, Язвіны, Бабоўня, Старая Гута. Звазіце іх таксама ў Стары Капыль — тут таксама вялікі патэнцыял для агратурызму, бо побач з райцэнтрам, дзе хоць і ёсць дзе адпачыць, у нас працуе шэсць кавярняў, але капыльчане, асабліва моладзь, з задавальненнем паедуць на прыроду... Вёска Астравок — таксама ўлюбёнае месца нашых людзей...

Міхаіл Тарасавіч падкрэсліў, што адміністрацыя раёна садзейнічае развіццю аграэкатурызму, але ён мог гэтага і не казаць. Сам прыём незнаёмых яму маладых людзей, якія толькі спыталі пра дамкі пад турыстычную сядзібу, паказаў неабыякавасць старшыні да гэтай тэмы. Ён прысвяціў нам амаль гадзіну свайго часу.

## БЕЗ ГАСПАДАРА

Аб'ехаць за адзін дзень усё, пра што казаў Міхаіл Бода, было немагчыма. Вольга Мікалаеўна Купрыенка прапанавала для пачатку агледзець безгаспадарчыя дамы, якія знаходзяцца на тэрыторыі яе сельсавета. Пачалі мы са Старога Капыля.

Каля першага дома, які нам сустрэўся, старшыня сельсавета прапанавала не спыняцца — настолькі ён выглядаў змрочным і закінутым. Але мы настаялі на тым, каб выйсці з машыны і падысці да яго бліжэй.

Зайсці ў двор было не праблемай, а вось патрапіць унутр хаты альбо зазірнуць у яе было немагчыма: дзверы і вокны зачыненыя, праз брудныя фіранкі нічога не бачна. Зрэшты, жадання такога ні ў кога і не ўзнікла, дастаткова было ўбачыць правалены дах, праселы фундамент, згнілы ганак, каб зразумець, што дом гэты для жытла непрыдатны, і ніякі рамонт тут не дапаможа. Участак таксама не выклікаў цікавасці. Прамавугольны, можа і дастатковых памераў углыб, але занадта вузкі, на некалькі метраў шырэй за дом, суседнія платы бязлітасна сціснулі яго з абодвух бакоў.



Косця смакуе вясковае жыццё.

Нашу ўвагу прыцягнула толькі дрэва, якое паглынула сабой нейкую сельскагаспадарчую прыладу: кавалак жалеза фантасмагарычна тырчаў са ствала.

— Не, — Паша пакруціў галавой. — З гэтага дома аграсядзібу не зробіш — мала месца, занадта вузкі двор.

Мы праехалі міма яшчэ некалькіх падобных хат. Хутка перасталі звяраць адрасы, бо і без таго было зразумела, што гэта — дамы без гаспадароў, амаль ужо напалову знішчаныя часам, ледзь не па вокны яны ўраслі ў зямлю. Не менш значным мінусам хлопцам падалася сама планіроўка вёскі — два паралельныя рады хат, якія стаяць шчыльна адна ля адной. Жыць у такіх вёсках, можа, і ўтульна, а вось турыстаў прымаць, напэўна, не вельмі зручна.

— Можа, варта паглядзець дамы на продаж, у якіх ёсць нашчадкі, якія іх хоць трохі даглядаюць? — з надзеяй спытаў Павел.

— Ёсць і такія, — адказала Вольга Мікалаеўна, — можам паглядзець адзін на ўскрайку вёскі і практычна на беразе возера, думаю, ён турыстам павінен спадабацца.

## ЛЯ ВОЗЕРА

Вёска з неадназначнай назвай Мазалі (тапанімічны слоўнік Жучкевіча сцвярджае, што назва паходзіць ад мянушкі, якую давалі чалавеку надакучліваму) аказалася прыгожай. Пафарбаваныя ў жыццярадасныя колеры хаты з белымі фіранкамі на вокнах, дагледжаныя агародчыкі, лаўкі ля акуратных платоў, агульныя калодзежы... Вёска даволі вялікая, але з двух дзясяткаў яе жыхароў пенсіянераў тут у паўтара раза больш, чым людзей працаздольнага ўзросту, а дзяцей усяго толькі двое. Можа, гэта іх мы ўбачылі напрыканцы вуліцы, якая нас цікавіла? Хлапчук гадоў сямі скакаў на нейкай дзіўнай прыладзе, падобнай на невялікую жалезную ступу са спружынай.

Дом мы пазналі адразу. Ён вылучаўся сваёй недагледжанасцю, хоць і быў у значна лепшым выглядзе, чым той, ля якога мы спыняліся раней. З каменным ганкам, невялікай верандай, ашаляваны, і калісьці таксама пафарбаваны ў жоўты, зялёны і блакітны, але фарба даўно паблякла і абсыпалася, жалезная брама і вароты ў плямах іржы, на страсе вырас мох, закрыліны згнілі і вось-вось адваляцца. Дом патрабуе тэрміновай дапамогі. Участак таксама вузкі і доўгі, але і тут прысутнасць суседзяў была адчувальнай. Дом, дарэчы, быў не самым апошнім на вуліцы.

Мы пайшлі паглядзець на возера. Яно крокаў за 50 ад дома. Невялікае, з зялёнай вадой і зарослым берагам. Можа, павудзіць рыбу альбо пасядзець ля вады тут было б і прыемна, але хлопцаў яно не ўразіла. І дом, мяркуючы па стрыманым маўчанні Пашы і Косці, мала адпавядаў іх уяўленням аб будучай аграсядзібе.

Затое вельмі ўразіла ўсіх суседняя сядзіба з яркімі варотамі, любоўна ўпрыгожанымі сімволікай алімпіяды 1980 года. Вароты гэтыя ўжо самі па сабе — цікавы турыстычны аб'ект. Нават мы не вытрымалі і сфатаграфаваліся на іх фоне.

А потым адправіліся далей. Наперадзе нас чакаў закінуты ФАП з востравам Кахання, Дом з прывідамі, і меў рацыю старшыня райвыканкама, — на дзіва прыгожае возера Багушы. Аповед пра гэта — у наступнай «серыі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Капыльскі раён.*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Лот №1**<br>**Капитальное строение инв. № 422/С-14138 и право заключения договора аренды земельного участка** |
| **Место нахождения объектов** | Гродненская область, Щучинский район, дер. Рожанка, ул. Советская, 22 |
| **Начальная цена предмета аукциона (тыс. руб.)** | 13 579,705 |
| **Сумма задатка (тыс. руб.)** | 1 357,000 |
| **Продавец недвижимого имущества** | Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: 8 (0152) 74-43-96 |
| **Характеристика объектов недвижимого имущества** | **Здание аптеки с погребом, верандой и холодной пристройкой** – 1929 года постройки, одноэтажное, отдельно стоящее, общая площадь 104,5 кв.м; фундамент бутобетонный, наружные стены бревенчатые; внутренние стены, перегородки и чердачные перекрытия деревянные; крыша жестяная и ши-ферная, полы дощатые, в пристройке – бетонные, плитка; электроосвещение – открытая проводка. Сарай – одноэтажный, отдельно стоящий, площадь застройки 31 кв.м, фундамент бетонный, стены блочные, перегородки деревянные, крыша шиферная, полы бетонные. Уборная дощатая с кирпичным выгребом, площадь застройки 1 кв.м. Колодец из бетонных колец, площадь застройки 1 кв.м. Забор из металлической сетки на металлических столбах с металлическими воротами и калиткой, общая площадь 91 кв.м. Дорожка бетонная, площадь 34 кв.м. |
| **Условия использования недвижимого имущества** | Благоустройство объекта и прилегающей территории |
| **Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)** | Земельный участок с кадастровым номером 425886515107000117 площадью 0,0826 га, срок договора аренды 30 лет |
| **Условия использования земельного участка; ограничения по его использованию** | Осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет при изменении цели предоставления земельного участка; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией |
| **Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)** | Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гродноблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел.: (8-0152) 74-53-86, 72-15-29, 74-53-82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) |

1. Аукцион состоится **10 сентября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по **4 сентября 2009 года до 16.00**, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, **кабинет 6.**

3. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

4. **К заявлению прилагаются следующие документы:**

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гродноблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ «Беларусбанк», УНП 500044549;
- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

5. При подаче документов представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

6. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

8. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

- заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;
- ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;
- ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

9. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Претенденту на покупку (участнику аукциона, выразившему согласие на приобретение предмета аукциона) сумма внесенного задатка учитывается при окончательных расчетах за право заключения договора аренды земельного участка и недвижимое имущество по договору купли-продажи. В случае отказа или уклонения претендента на покупку от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходов, связанных с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков, внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка, заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка, внесенный им задаток возврату не подлежит.

10. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

11. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

12. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2-х рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

13. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа.

14. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

15. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества, договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.



**ЗНАМЕНКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома**

**Лот № 1** земельный участок № 1 площадью 0,1963 га, расположенный по адресу: д. Загорье, стартовая цена 1 451 270 белорусских рублей;

**Лот № 2** земельный участок № 2 площадью 0,1945 га, расположенный по адресу: д. Загорье, стартовая цена 1 437 960 белорусских рублей;

**Лот № 3** земельный участок № 3 площадью 0,1952 га, расположенный по адресу: д. Загорье, стартовая цена 1 443 140 белорусских рублей;

**Лот № 4** земельный участок № 4 площадью 0,1604 га, расположенный по адресу: д. Загорье, стартовая цена 1 188 810 белорусских рублей;

**Лот № 5** земельный участок № 1 площадью 0,2320 га, расположенный по адресу: д. Свидно, стартовая цена 1 485 270 белорусских рублей;

**Лот № 6** земельный участок № 2 площадью 0,2320 га, расположенный по адресу: д. Свидно, стартовая цена 1 485 270 белорусских рублей;

Повторно выставляется на аукцион

**Лот № 7** земельный участок площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: д. Карцовщина, стартовая цена 1 340 630 белорусских рублей.

Размер задатка — 10 % стартовой цены участка проплатить на р/счет Знаменковского сельисполкома № 3600619051103 ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», 601, г. Логойск, УНП 600181564, код платежа 04901.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Аукцион состоится **9 сентября 2009 года** в 10.00 по адресу: д. Знаменка, Логойского района, Минской области. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **8 сентября 2009 г.** до 13.00 по вышеуказанному адресу.

**Телефоны: (801774) 59 335, 59 336, 143 55 53.**



В опубликованном годовом балансе за 2008 год республиканского дочернего унитарного предприятия «Стравита» в газете «Звязда» № 74 (26432) от 21 апреля 2009 г. в графе 2 строки «Прочие активы – всего,» **следует читать 54 508 976,3.**

В публикации годового баланса ИСЗАО «Генерали» за 2008 год в газете «Звязда» от 11.04.09 г. № 68 в балансе в строке финансовые вложения **следует читать – 0,** в строке денежные средства – **3679,3 млн руб.**

20.08.2009 г. в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

**Повестка дня:**

1. О прибыли Общества.
2. О предоставлении безвозмездной спонсорской помощи.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Начало регистрации участников собрания – 12.00. УНН 400022623.

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

Открытое акционерное общество «Белхимэнерго», находящееся по адресу: 220024, г. Минск, пер. Асаналиева, 3, намерено приобрести простые именные акции собственного выпуска в количестве 102 503 шт. по цене 1 750 (одна тысяча семьсот пятьдесят) белорусских рублей за одну акцию.

Оплата приобретаемых акций будет осуществляться путем безналичного перечисления денежных средств на открытые акционерами банковские счета в течение 15 дней с момента совершения реестродержателем (ОАО «Белвнешэкономбанк») операций по фиксации передачи прав на ценные бумаги путем перевода акций по счетам «депо».

Предложения акционеров о продаже акций будут приниматься по месту нахождения эмитента в срок с 09 августа 2009 г. — по 08 ноября 2009 г.

Покупка акций будет осуществляться в период с 09 ноября 2009 г. — по 08 февраля 2010 г.

Договоры купли-продажи акций будут заключаться по месту нахождения депозитария эмитента (ОАО «Белвнешэкономбанк») по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32. УНН 100363932



## ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь зем. участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Острошицы | 0,25 | В непосредственной близости сети электроснабжения, газоснабжения | 4 268 000 | 430 000 | 1 280 470 |
| 2 | аг. Острошицы | 0,25 | В непосредственной близости сети электроснабжения, газоснабжения | 4 268 000 | 430 000 | 1 280 470 |
| 3 | д. Бояры | 0,2202 | В непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения | 1 943 160 | 200 000 | 1 280 470 |
| 4 | д. Лобунщина | 0,1281 | В непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения | 1 321 850 | 130 000 | 1 290 600 |
| 5 | д. Чуденичи | 0,2048 | В непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения | 4 113 220 | 410 000 | 1 280 470 |
| 6 | д. Чуденичи | 0,1510 | В непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения | 3 032 700 | 300 000 | 1 280 470 |

Задаток перечисляется на р/с 3600619141101, ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление ОАО АСБ «Беларусбанк», код банка 153001601, УНН 600181707, Острошицкий сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится **10 сентября 2009 г.** по адресу: аг. Острошицы, ул. Центральная, 8, в здании Острошицкого сельского исполнительного комитета.

**Справки по телефонам: 801774 57 6 35, 57 6 36, 57 6 21.**

УНП 600181707 **Администрация.**


## ХТО БОЛЬШ МОЖА СКРАСЦІ?

**Незвычайныя спаборніцтвы разгарнуліся сярод кіраўнікоў крамаў спажывецкай кааперацыі Віцебскай вобласці. Адну падазраюць у крадзяжы 11 мільёнаў рублёў, другую — на амаль што 14 мільёнаў. Цяпер яны чакаюць законнага пакарання.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **старшы пракурор аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Віцебскай вобласці Васіль ПАШКОЎСКІ**, сёлета з зарэгістраваных на тэрыторыі Прыдзвінскага краю ўжо больш за 330 карупцыйных злачынстваў — 75 учынена менавіта ў сферы гандлю.

У абласным цэнтры загадчыца крамы за год зарабіла незаконна 14 мільёнаў рублёў. А ўсё дзякуючы таму, што ўносіла фальшывыя звесткі ў касавыя кнігі. Яе ўжо асудзілі на 3 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Ды яшчэ трэба скрадзеныя грошы вяртаць.

Загадчыца крамы аршанскай спажывецкай кааперацыі яшчэ падчас папярэдняга расследавання вярнула скрадзеныя 2,5 мільёна рублёў і пазбегла магчымага расставання з воляй. Але штраф — а гэта больш за 1 мільён — давядзецца заплаціць. Ды яшчэ і звольніцца прыйшлося, а таксама рашэннем суда на паўтара года забаранілі займаць аналагічную пасаду.

Несумленныя гандлёвыя работнікі ведаюць як можна схітрыць, каб схаваць падман. І ў афіцыйных паперах што трэба ім напішуць, і быццам бы ў крэдыт тавары адпускалі... Але ў праваахоўных і кантралюючых органах таксама не дурні працуюць. Абавязкова разбяруцца і знойдуць вінаватых...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

